17.01.2025

# КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Праект для грамадскага абмеркавання

прастора
законы.рэформы.канстытуцыя

## Змест

ГЛАВА 1. АСНОВЫ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ЛАДУ.......... 3
ГЛАВА 2. ПРАВЫ, СВАБОДЫ І АБАВЯЗКІ ЧАЛАВЕКА.......... 6
ГЛАВА 3. ВЫБАРЫ.......... 19
ГЛАВА 4. РЭФЕРЭНДУМ.......... 22
ГЛАВА 5. СОЙМ.......... 24
ГЛАВА 6. ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.......... 32
ГЛАВА 7. УРАД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.......... 36
ГЛАВА 8. МЯСЦОВЫ САМАКІРАВАННЕ.......... 41
ГЛАВА 9. СУДОВАЯ УЛАДА.......... 44
ГЛАВА 10. КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД.......... 48
ГЛАВА 11. ПРАКУРАТУРА.......... 50
ГЛАВА 12. АДВАКАТУРА.......... 51
ГЛАВА 13. УПАЎНАВАЖАНЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА.......... 52
ГЛАВА 14. КАНТРОЛЬНАЯ ПАЛАТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.......... 55
ГЛАВА 15. КАМІТЭТ ПА НАГЛЯДЗЕ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ СЛУЖБ РАЗВЕДКІ І БЯСПЕКІ.......... 56
ГЛАВА 16. КАМІТЭТ ПА ЭТЫЦЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ СЛУЖБЫ І СУПРАЦЬДЗЕЯННІ КАРУПЦЫІ.......... 58
ГЛАВА 17. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ФІНАНСЫ.......... 60
ГЛАВА 18. ЗМЯНЕННЕ КАНСТЫТУЦЫІ.......... 62
ГЛАВА 19. ПЕРАХОДНЫЯ І ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.......... 64

*Мы, народ Беларусі,*

*усведамляючы сваю адказнасць перад сучасным і будучымі пакаленнямі,*

*абапіраючыся на шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасці ад Полацкага княства і Вялікага княства Літоўскага да Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і да нашых дзён,*

*аддаючы належнае праву, па-беларуску ўвасобленаму ў Статутах Вялікага княства Літоўскага, Статутных граматах Беларускай Народнай Рэспублікі і беларускіх Канстытуцыях,*

*сцвярджаючы неад'емнасць права беларускага народа на самавызначэнне і дзяржаўную незалежнасць,*

*пацвярджаючы сваю прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцяў, правоў і свабод чалавека,*

*імкнучыся да дабрабыту кожнага чалавека і росквіту краіны, міру і згоды на беларускай зямлі,*

*шануючы і зберагаючы нацыянальную самабытнасць, мову і культуру,*

*жадаючы развіваць прыязныя стасункі і супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі,*

*прымаем гэтую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.*

# ГЛАВА 1. АСНОВЫ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ЛАДУ

## *Артыкул 1. Рэспубліка Беларусь*

1. Рэспубліка Беларусь – Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.

2. Найменні Рэспубліка Беларусь і Беларусь раўназначныя.

3. Рэспубліка Беларусь мае на сваёй тэрыторыі ўсю паўнату ўлады, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

4. Беларусь абараняе свой суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак.

## *Артыкул 2. Дэмакратыя*

1. Чалавек, яго правы і свабоды з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю. Галоўны абавязак дзяржавы - прызнанне, выкананне, забеспячэнне і абарона правоў і свабод чалавека, стварэнне ўмоў для шчаслівага жыцця, свабоднага і годнага развіцця асобы.

2. Адзінай крыніцай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ.

3. Народ ажыццяўляе сваю ўладу праз сваіх прадстаўнікоў, абраных дэмакратычным шляхам, а таксама непасрэдна ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй і законам.

4. Ніхто не можа прысвойваць сабе уладу народа. Захоп улады ці прысваенне ўладных паўнамоцтваў караюцца па законе.

5. Народ і кожны грамадзянін маюць права на супраціўленне тыраніі і прыгнёту з боку любога, хто робіць замах на асновы канстытуцыйнага ладу і ажыццяўленне дэмакратычных правоў і свабод чалавека, калі выкарыстанне законных сродкаў аказваецца немагчымым.

## *Артыкул 3. Падзел улады*

1. Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

2. У Рэспубліцы Беларусь прызнаецца і гарантуецца мясцовае самакіраванне, да кампетэнцыі якога адносяцца пытанні мясцовага значэння. Органы мясцовага самакіравання не ўваходзяць у сістэму органаў дзяржаўнай улады.

3. Органы заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады і мясцовага самакіравання ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя, яны стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго, іх дзейнасць адкрыта і падсправаздачная грамадзянам.

## *Артыкул 4. Тэрыторыя*

1. Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца натуральнай умовай існавання і прасторавай мяжой самавызначэння народа, асновай яго дабрабыту і суверэнітэту Беларусі.

2. Тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная.

3. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад Рэспублікі Беларусь вызначаецца арганічным законам.

4. Дзяржава садзейнічае ўстойліваму і суразмернаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

## *Артыкул 5. Вяршэнства права*

1. У Рэспубліцы Беларусь прызнаецца і выконваецца прынцып вяршэнства права.

2. Канстытуцыя мае вышэйшую юрыдычную сілу і прамое дзеянне

3. Органы дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, службовыя, юрыдычныя і фізічныя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй нарматыўных прававых актаў.

4. Нарматыўныя прававыя акты або іх асобныя палажэнні, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку супярэчнымі Канстытуцыі, не маюць юрыдычнай сілы.

5. Рэспубліка Беларусь выконвае свае абавязацельствы па міжнародным праве і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.

6. Ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь міжнародныя дамовы маюць прыярытэт перад законамі і з'яўляюцца часткай нацыянальнай прававой сістэмы.

7. Не дапускаецца заключэнне Рэспублікай Беларусь міжнародных дагавораў, якія не адпавядаюць Канстытуцыі.

8. Нарматыўныя прававыя акты падлягаюць афіцыйнаму апублікаванню на ўсіх дзяржаўных мовах. Неапублікаваныя нарматыўныя прававыя акты не прымяняюцца.

## *Артыкул 6. Асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі*

1. Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, забяспечвае бяспеку і незалежнасць краіны, дабрабыт грамадзян, выступае за мірны і справядлівы міжнародны парадак, прасоўвае свае інтарэсы і садзейнічае свабоднаму гандлю.

2. Беларусь імкнецца да статусу сталага нейтралітэту. Тэрыторыя дзяржавы вольная ад зброі масавай паразы, уключаючы ядзерную. Прапаганда вайны ў Рэспубліцы Беларусь забаронена.

3. Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні або міжнародныя арганізацыі і выходзіць з іх. Рашэнне аб уваходжанні ў міждзяржаўнае ўтварэнне або міжнародную арганізацыю, якое прадугледжвае перадачу часткі дзяржаўных паўнамоцтваў наддзяржаўным органам, прымаецца на нацыянальным рэферэндуме.

4. Беларусь не можа ўваходзіць у міждзяржаўнае ўтварэнне або міжнародную арганізацыю, калі ў выніку яна страчвае сваю незалежнасць і паўнапраўную міжнародную правасуб'ектнасць.

## *Артыкул 7. Дзяржаўная мова[1]*

## *Артыкул 8. Дзяржаўныя сімвалы*

1. Дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца яе флаг, герб, гімн і дэвіз.

[1] Пытанне аб дзяржаўнай мове (мовах) будзе пастаўлена асобна на Нацыянальным рэферэндуме.

2. Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з трох гарызантальна размешчаных каляровых палос роўнай шырыні: верхняй і ніжняй белага, а сярэдняй чырвонага колеру. Адносіны шырыні флага да яго даўжыні - 1:2.

3. Дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца герб "Пагоня", які ўяўляе сабой відарыс размешчанага на чырвоным фоне вершніка белага колеру, звернутага ў левы бок, з паднятым мечам і шчытом з крыжом.

4. Дэвіз дзяржавы - "Жыве Беларусь!".

5. Эталоннае апісанне і парадак выкарыстання дзяржаўных сімвалаў устанаўліваюцца арганічным законам.

### *Артыкул 9. Сталіца*

1. Сталіца Рэспублікі Беларусь - горад Мінск.

2. Статус горада Мінска вызначаецца арганічным законам.

---

## ГЛАВА 2. ПРАВЫ, СВАБОДЫ І АБАВЯЗКІ ЧАЛАВЕКА

### *Артыкул 10. Прызнанне правоў і свабод чалавека*

1. Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах.

2. Годнасць асобы недатыкальная і падлягае ахове як пры жыцці, так і пасля смерці чалавека.

3. Правы і свабоды чалавека натуральныя і неад'емныя.

4. Заканадаўчая і выканаўчая ўлада, мясцовае самакіраванне і правасуддзе абавязаны захоўваць правы і свабоды чалавека як непасрэдна дзейнае права. Дзяржава забяспечвае эфектыўныя механізмы прасоўвання правоў чалавека і прававой абароны ў адносінах да любых парушэнняў індывідуальных і калектыўных правоў.

5. Кожны чалавек, карыстаючыся сваімі правамі і свабодамі, павінен паважаць і выконваць правы, свабоды і годнасць іншых людзей.

6. Кожны чалавек мае права індывідуальна і сумесна з іншымі заахвочваць, абараняць і здзяйсняць правы і свабоды чалавека на нацыянальных і міжнародных узроўнях.

### *Артыкул 11. Грамадзянства*

1. Грамадзянства Рэспублікі Беларусь набываецца па праве нараджэння і іншых падставах, прадугледжаных законам, з'яўляецца роўным незалежна ад падстаў набыцця.

2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь могуць мець грамадзянства іншых дзяржаў.

3. Грамадзянам гарантуецца абарона і падтрымка дзяржавы як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі.

4. Ніхто не можа быць пазбаўлены грамадзянства ці права змяніць грамадзянства.

5. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь не могуць быць выдадзены замежнай дзяржаве, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

6. Набыццё і спыненне грамадзянства здзяйсняюцца ў адпаведнасці з арганічным законам.

## *Артыкул 12. Правы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства*

1. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь карыстаюцца правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі Беларусі, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй, законамі і міжнароднымі дагаворамі.

2. Асобам, якія пераследуюцца ў іншых дзяржавах за палітычныя, рэлігійныя перакананні нацыянальную прыналежнасць або іншым матывам прадастаўляецца права прыстанішча ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права.

3. Ніхто не можа быць прымусова высланы, вернуты або іншым спосабам высланы ў краіну, дзе для дадзенай асобы існуе сур'ёзная небяспека вынясення смяротнага прыгавору, прымянення катаванняў або іншых форм бесчалавечнага або прыніжаючага годнасць абыходжання або пакарання.

## *Артыкул 13. Права на жыццё*

1. Кожны чалавек мае неад'емнае права на жыццё.

2. Смяротнае пакаранне як мера пакарання забараняецца.

3. Кожны чалавек мае права абараняць сваё жыццё і здароўе, жыццё і здароўе іншых асоб ад супрацьпраўных замахаў.

## *Артыкул 14. Забарона катаванняў*

1. Ніхто не павінен падвяргацца катаванням, жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажаючаму годнасць абыходжанню ці пакаранню.

2. Ніхто не можа без добраахвотнай згоды быць падвергнуты медыцынскім, навуковым ці іншым вопытам.

## *Артыкул 15. Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць*

1. Кожны чалавек мае права на свабоду і асабістую недатыкальнасць.

2. Абмежаванне або пазбаўленне волі магчыма толькі па рашэнні суда ў выпадках і парадку, устаноўленых законам. Да вынясення судовага рашэння не дапускаецца затрыманне і ўтрыманне чалавека пад вартай больш за 48 гадзін.

3. Кожнаму, хто пазбаўлены волі, неадкладна паведамляецца на зразумелай яму мове і зразумелым яму спосабам прычына пазбаўлення волі і яго правы, а таксама даецца магчымасць паведаміць аб пазбаўленні волі сваім блізкім, адвакату або іншым асобам па яго меркаванні.

4. Ніхто не можа быць пазбаўлены волі толькі на той падставе, што ён не можа выканаць якія-небудзь дагаворныя абавязкі.

5. Асоба, пазбаўленая волі незаконным або неабгрунтаваным спосабам, або асуджаная беспадстаўна, мае права на кампенсацыю стратаў ад дзяржавы.

6. Усе асобы, пазбаўленыя волі, маюць права на гуманнае абыходжанне і павагу годнасці. Дзяржава стварае ўмовы ўтрымання ў пенітэнцыярных установах, якія садзейнічаюць выпраўленню асуджаных.

## *Артыкул 16. Права на справядлівы суд*

1. Кожнай асобе гарантуецца абарона яе правоў і свабод незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам разумныя тэрміны.

2. Кожны чалавек мае права на судовую абарону гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі.

3. Кожны абвінавачаны ў здзяйсненні злачынства павінен быць неадкладна і падрабязна праінфармаваны на зразумелай яму мове аб характары і падставе прад'яўленага яму абвінавачання.

4. Ніхто не павінен прымушацца да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, чальцоў сваёй сям'і, блізкіх сваякоў.

5. Кожны абвінавачаны мае права дапытваць сведкаў, якія паказваюць супраць яго, а таксама права на выклік і допыт сведкаў, якія паказваюць на яго карысць на тых жа ўмовах, што і сведак абвінавачання.

6. Кожны чалавек мае права спагнаць у судовым парадку як маёмасную шкоду, так і матэрыяльнае пакрыццё маральнай шкоды.

7. Не дапускаецца адмова ў судовай абароне, у тым ліку па матывах адсутнасці, непаўнаты, супярэчлівасці, няяснасці нарматыўнага прававога акта.

## *Артыкул 17. Пакаранне выключна на падставе закона*

1. Кожны чалавек лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана па-за ўсякім абгрунтаваным сумненнем і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу. Абвінавачаная асоба не абавязана даказваць сваю невінаватасць. Доказы,

атрыманыя з парушэннем закону, не маюць юрыдычнай сілы. Неадхільныя сумневы ў вінаватасці асобы тлумачацца на карысць абвінавачанага.

2. Ніхто не можа быць асуджаны за здзяйсненне якога-небудзь дзеяння або за бяздзейнасць, якая згодна з дзеючым у момант яго здзяйснення законам не падлягае пакаранню. Не можа таксама накладацца пакаранне больш цяжкае, чым тое, якое падлягала прымяненню ў момант учынення злачынства або правапарушэння. Калі пасля ўчынення злачынства закон уводзіць больш мяккае пакаранне, то павінна прымяняцца апошняе.

3. Ніхто не павінен быць паўторна судзімы або пакараны за злачынства, па якім ён ужо быў канчаткова асуджаны або апраўданы.

## *Артыкул 18. Права на эфектыўныя сродкі прававой абароны*

1. Кожны чалавек мае права абскардзіць у судзе рашэнне або дзеянне (бяздзеянне) дзяржаўнага органа, органа мясцовага самакіравання або службовай асобы, якімі ўшчамляюцца яго правы і свабоды ў парадку, вызначаным Канстытуцыяй і законам.

2. Кожнаму чалавеку гарантуецца права звярнуцца з канстытуцыйнай скаргай у Канстытуцыйны Суд на падставах, устаноўленых дадзенай Канстытуцыяй, і ў парадку, вызначаным законам.

3. Кожны чалавек мае права ў адпаведнасці з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь, звяртацца ў міжнародныя арганізацыі з мэтай абароны сваіх правоў і свабод. Рашэнні міжнародных арганізацый, прынятыя па сутнасці такіх зваротаў, публікуюцца ў Рэспубліцы Беларусь і абавязковыя для выканання дзяржаўнымі органамі.

## *Артыкул 19. Права на юрыдычную дапамогу*

1. Кожны чалавек мае права на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку мець дастатковы час і магчымасці для падрыхтоўкі сваёй абароны, права абараняць сябе асабіста або карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага самакіравання, ва ўстановах, арганізацыях, у адносінах са службовымі асобамі і грамадзянамі.

2. У выпадках, прадугледжаных законам, юрыдычная дапамога і дапамога перакладчыка аказваюцца бясплатна за кошт дзяржаўных сродкаў.

## *Артыкул 20. Недатыкальнасць прыватнага жыцця*

1. Кожны чалавек мае права на недатыкальнасць прыватнага жыцця, у тым ліку асабістую і сямейную таямніцу, таямніцу запісаў, перапіскі і перагавораў з выкарыстаннем любых сродкаў.

2. Кожны чалавек мае права самастойна вырашаць, якая інфармацыя аб ім можа быць перададзена іншым асобам і пры якіх абставінах, а таксама ва

ўстаноўленых законам выпадках на забеспячэнне канфідэнцыйнасці і цэласнасці персанальнай інфармацыі, якая захоўваецца ў іншых асоб.

## Артыкул 21. Свабода думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў

1. Кожны чалавек валодае свабодай думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў.

2. У Рэспубліцы Беларусь прызнаецца разнастайнасць ідэалогій і меркаванняў, ніякая ідэалогія не можа ўстанаўлівацца ў якасці дзяржаўнай або абавязковай.

3. Кожны чалавек мае права вызнаваць індывідуальна ці сумесна з іншымі любую рэлігію ці не вызнаваць ніякай, публічнай ці прыватнай выявай выконваць рэлігійныя абрады, карыстацца рэлігійнай дапамогай па месцы свайго знаходжання, свабодна выбіраць, мець і распаўсюджваць рэлігійныя і іншыя светапоглядныя перакананні і дзейнічаць у адпаведнасці з імі.

4. Рэлігіі роўныя перад законам. Ніякая рэлігія не можа ўстанаўлівацца ў якасці дзяржаўнай або абавязковай. Свабода дзейнасці рэлігійных арганізацый гарантуецца ў рамках Канстытуцыі і законаў.

## Артыкул 22. Свабода выказвання меркавання

1. Кожны чалавек мае права свабодна выказваць сваё меркаванне. Гэтае права ўключае свабоду атрымліваць, здабываць з агульнадаступных крыніц і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі, незалежна ад дзяржаўных межаў.

2. Абмежаванне доступу да сеткі інтэрнэт або да якой-небудзь яго часткі, запаволенне аперацый у сетцы інтэрнэт у цэлым або ў якіх-небудзь яго частках не дапускаецца.

3. Сродкам масавай інфармацыі гарантуюцца свабода слова і рэдакцыйная таямніца. Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі дзяржавай ці асобнымі асобамі не дапускаецца. Цэнзура забаронена.

## Артыкул 23. Свабода аб'яднанняў

1. Кожны чалавек мае права на свабоду аб'яднанняў, у тым ліку права ствараць, уступаць і ўдзельнічаць у дзейнасці аб'яднанняў для выказвання і абароны сваіх інтарэсаў. Ажыццяўленне гэтага права не патрабуе папярэдняга дазволу.

2. Грамадзяне маюць права ствараць палітычныя партыі і ўдзельнічаць у іх дзейнасці. Палітычныя партыі садзейнічаюць выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян, маюць права ўдзельнічаць у выбарах.

3. Ніхто не можа быць прымушаны да ўступлення ў якое-небудзь аб'яднанне, да выхаду з яго або абмежаваны ў правах за прыналежнасць да яго.

## Артыкул 24. Свабода сходаў

1. Свабода мірных сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання з'яўляецца неад'емным правам кожнага чалавека.

2. Кожны чалавек мае права без папярэдняга дазволу арганізоўваць сходы і іншыя масавыя мерапрыемствы, удзельнічаць ці не ўдзельнічаць у іх.

3. Законам можа быць прадугледжана своечасовае апавяшчэнне органаў выканаўчай улады або органаў мясцовага самакіравання, калі сход або іншае масавае мерапрыемства праводзіцца ў месцах руху транспарту.

## *Артыкул 25. Шлюб і сям'я*

1. Усе людзі па дасягненні шлюбнага ўзросту валодаюць правам ствараць сям'ю і браць шлюб. Неабходныя ўмовы для заключэння шлюбу і наступствы ўступлення ў яго, а таксама ўмовы і наступствы яго скасавання рэгулююцца законам. Сужэнцы маюць роўныя правы ў шлюбе і сям'і.

2. Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, маюць права і абавязаны выхоўваць дзяцей, клапаціцца аб іх здароўі, развіцці і навучанні. Паўналетнія працаздольныя дзеці абавязаны клапаціцца аб непрацаздольных бацьках, якія маюць патрэбу ў дапамозе, а таксама аб асобах, якія іх замяняюць.

3. Дзеці не могуць быць аддзелены ад сваёй сям'і супраць волі бацькоў і іншых асоб, якія іх замяняюць, акрамя як толькі на падставе рашэння суда, калі бацькі або іншыя асобы, якія іх замяняюць, не выконваюць сваіх абавязкаў і такое разлучэнне неабходна для найлепшага забеспячэння інтарэсаў дзіцяці .

4. Шлюб, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы.

## *Артыкул 26. Правы дзіцяці*

1. Кожнае дзіця ажыццяўляе правы і свабоды чалавека ў адпаведнасці са сваім узростам і ўзроўнем сталасці.

2. Дзіця мае права на спецыяльную абарону яго жыцця і здароўя, на магчымасць усебаковага развіцця яго асобы ва ўмовах свабоды і павагі яго годнасці. Дзіця не павінна падвяргацца жорсткаму абыходжанню або прыніжэнню, прыцягвацца да работ, якія могуць нанесці шкоду яго фізічнаму, разумоваму або маральнаму развіццю.

3. Дзецям гарантуецца адмысловая абарона ад сацыяльнай, эканамічнай, фізічнай, псіхічнай ці іншай эксплуатацыі ці злоўжыванняў. Правы дзіцяці падтрымліваюцца і ахоўваюцца дзяржавай у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і спецыяльным законам.

## *Артыкул 27. Забарона дыскрымінацыі*

Ніхто не павінен падвяргацца дыскрымінацыі, прама ці ўскосна, на падставе фактычных або меркаваных асабістых асаблівасцяў або абставін, у тым ліку па прыкметах полу, узросту, колеру скуры, расы, паходжання, гендэрнай ідэнтычнасці, сэксуальнай арыентацыі, культуры, нацыянальнасці, грамадзянства, мовы, рэлігійных перакананняў, ідэалогіі, палітычных ці філасофскіх поглядаў, грамадзянскага стану, эканамічнага і сацыяльнага становішча, роду заняткаў,

адукацыйнага ўзроўню, інваліднасці, разумовых ці фізічных асаблівасцяў, цяжарнасці, ці па іншых прыкметах.

## Артыкул 28. Роўнасць

1. Усе роўныя перад законам і маюць права на роўную абарону з боку закону.

2. Дзяржава садзейнічае прасоўванню гендэрнай роўнасці, гендэрнага навучання і выхавання.

3. Дзяржава прымае спецыяльныя меры з мэтай забеспячэння поўнай і эфектыўнай роўнасці да неабароненых груп насельніцтва.

## Артыкул 29. Свабода перамяшчэння

Кожны чалавек, які знаходзіцца ў краіне на законных падставах, мае права свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, а таксама свабодна яе пакідаць. Грамадзянам і асобам, якія маюць права пражываць у Рэспубліцы Беларусь, гарантавана права свабоднага вяртання ў Беларусь.

## Артыкул 30. Права ўласнасці

1. Права ўласнасці, недатыкальнасць уласнасці, права яе атрымання ў спадчыну ахоўваюцца законам.

2. Кожны чалавек мае права мець маёмасць ва ўласнасці, валодаць, карыстацца і распараджацца маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі асобамі.

3. Законам могуць быць вызначаны аб'екты, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы або мясцовага самакіравання, або ўстаноўлены асобы парадак пераходу іх ва ўласнасць прыватных асоб. Дзяржава ажыццяўляе кантроль за рацыянальным выкарыстаннем зямлі і іншых прыродных рэсурсаў.

4. У Рэспубліцы Беларусь па рашэнню суда дапускаецца канфіскацыя маёмасці, нажытай незаконным шляхам.

5. Прымусовае адчужэнне ўласнасці дапускаецца толькі па матывах грамадскай неабходнасці, на падставе і ў парадку, устаноўленых законам, і пры ўмове поўнай кампенсацыі кошту маёмасці, якая адчужаецца.

6. Кожная асоба, чыя ўласнасць была адчужана без яе згоды, мае права звярнуцца ў суд, каб аспрэчыць факт адчужэння, вырашыць пытанне аб кампенсацыі або аб яе памеры.

## Артыкул 31. Недатыкальнасць жылля

1. Жыллё недатыкальнае.

2. Ніхто не мае права без законнай падставы пранікаць у жыллё і іншыя ўладанні супраць волі ўладальніка.

## Артыкул 32. Права на ўдзел у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы

1. Грамадзяне маюць права ўдзельнічаць у кіраванні справамі дзяржавы і мясцовага самакіравання праз сваіх дэмакратычна абраных прадстаўнікоў, а таксама непасрэдна ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй і законам.

2. Непасрэдны ўдзел грамадзян у кіраванні дзяржаўнымі справамі і справамі мясцовага самакіравання забяспечваецца правядзеннем рэферэндумаў, грамадскім абмеркаваннем праектаў нарматыўных прававых актаў і пытанняў дзяржаўнага і мясцовага значэння, грамадскім кантролем за дзеяннямі органаў улады і іншымі вызначанымі законам спосабамі.

3. Дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, а таксама службовыя асобы абавязаны падтрымліваць адкрыты, празрысты і рэгулярны дыялог з грамадзянамі і іх аб'яднаннямі, праводзіць шырокія кансультацыі з зацікаўленымі асобамі.

4. Працэс прыняцця рашэнняў у дзяржаўных органах і органах мясцовага самакіравання з'яўляецца адкрытым і набліжаным да грамадзян.

## Артыкул 33. Выбарчае права

1. Грамадзяне маюць права свабодна абіраць і быць абранымі ў дзяржаўныя органы і органы мясцовага самакіравання, а таксама ўдзельнічаць у рэферэндумах.

2. Выбарчыя правы грамадзян устанаўліваюцца Канстытуцыяй і арганічным законам.

## Артыкул 34. Права займаць пасады ў дзяржаўных органах і органах мясцовага самакіравання

1. Грамадзяне ў адпаведнасці са сваімі здольнасцямі і прафесійнай падрыхтоўкай маюць права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах і органах мясцовага самакіравання.

2. Пасады Прэзідэнта, Старшыні Сойма, Прэм'ер-міністра не могуць займаць грамадзяне Беларусі, якія адначасова з'яўляюцца грамадзянамі іншай дзяржавы.

## Артыкул 35. Права на звароты

1. Кожны чалавек мае права звяртацца асабіста, а таксама накіроўваць індывідуальныя ці калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы і органы мясцовага самакіравання.

2. Дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, а таксама службовыя асобы абавязаны разгледзець зварот і даць адказ па сутнасці ў разумны тэрмін, вызначаны законам. Адмова ад разгляду пададзенага звароту павінна быць матываванай.

## *Артыкул 36. Права на доступ да публічнай інфармацыі*

1. Грамадзяне маюць права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, устаноў і арганізацый, органаў мясцовага самакіравання, у тым ліку аб прынятых імі рашэннях і выкарыстанні фінансавых сродкаў. Уся агульнадаступная інфармацыя павінна размяшчацца публічна ў стандартных фарматах адчыненых дадзеных.

2. Кожнай асобе гарантуецца бясплатны доступ да нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

3. Дзяржаўныя органы, установы і арганізацыі, органы мясцовага самакіравання, службовыя асобы абавязаны прадаставіць кожнаму чалавеку магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі, якія закранаюць яго правы і законныя інтарэсы, забяспечыць доступ да інфармацыі, якая была сабрана ў адносінах да яго, а таксама магчымасць вырабіць копію ўсіх названых матэрыялаў.

## *Артыкул 37. Права на працу і свабоду працы*

1. Кожны чалавек мае права на працу і свабоду працы, права свабодна распараджацца сваімі здольнасцямі да працы, выбіраць род дзейнасці і прафесію ў адпаведнасці з прызначэннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы. Дзяржава стварае ўмовы для дастойнай працы і садзейнічае занятасці.

2. Грамадзяне маюць права на абарону ад беспрацоўя, у тым ліку частковага. У выпадку незанятасці асобы па не залежных ад яе прычынах ёй гарантуюцца на ўмовах і ў парадку, прадугледжаных законам, выплата дапамогі па беспрацоўю ў належным аб'ёме, які не можа быць ніжэйшы за ўзровень бюджэту пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва, а таксама іншыя віды дапамогі.

3. Працаўнікі маюць права на адпачынак. Кожны работнік мае права на абмежаванне максімальнай працягласці працоўнага часу і права на штодзённы і штотыднёвы час адпачынку, а таксама на штогадовы аплачаны водпуск.

4. Працуючыя па працоўным дагаворы маюць права на справядлівую ўзнагароду за выкананую работу, але не ніжэй за ўстаноўлены дзяржавай мінімальны памер. Усе маюць права на роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці.

5. Прымусовая праца забараняецца, акрамя работы або службы, якая вызначаецца прыгаворам суда або ў адпаведнасці з законам аб ваенным і надзвычайным становішчы.

## *Артыкул 38. Права на абарону эканамічных і сацыяльных інтарэсаў*

1. Усе людзі маюць права на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, у тым ліку права на свабоднае аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, заключэнне

калектыўных дагавораў (пагадненняў) і права звяртацца да калектыўных дзеянняў, уключаючы забастоўку, для абароны сваіх інтарэсаў.

2. Звальненне работнікаў па ініцыятыве наймальніка ў сувязі з іх удзелам у калектыўнай працоўнай спрэчцы або забастоўцы забараняецца.

3. Сацыяльна-працоўныя адносіны будуюцца на прынцыпах сацыяльнага партнёрства. Нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць сацыяльна-працоўныя адносіны, прымаюцца пасля публічнага абмеркавання і кансультацый з сацыяльнымі партнёрамі.

## *Артыкул 39. Права на асабістую ініцыятыву і свабоду прадпрымальніцтва*

1. Кожны чалавек мае права на асабістую ініцыятыву і свабоду прадпрымальніцтва.

2. Прадпрымальніцкая дзейнасць дэпутатаў, службовых асоб органаў дзяржаўнай улады і органаў мясцовага самакіравання абмяжоўваецца законам.

3. Законам можа быць прадугледжана выключнае права дзяржавы на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці.

4. Не дапускаюцца нядобрасумленная канкурэнцыя і абмежаванне канкурэнцыі, злоўжыванне дамінуючым становішчам на рынку. Дзейнасць натуральных манаполій рэгулюецца законам.

5. Дзяржава стварае роўныя ўмовы гаспадарання для ўсіх эканамічных суб'ектаў, стымулюе добрасумленную канкурэнцыю, заахвочвае прадпрымальніцтва, эканамічныя ініцыятывы грамадзян, падтрымлівае адкрытасць унутранага і знешняга гандлю і інвестыцый. Закон абараняе правы суб'ектаў гаспадарання і ўстанаўлівае іх адказнасць за парушэнне заканадаўства.

6. Правы спажыўцоў абараняюцца законам.

## *Артыкул 40. Права на адукацыю і акадэмічная свабода*

1. Кожны чалавек мае права на адукацыю.

2. У Рэспубліцы Беларусь прызнаецца каштоўнасць адукацыі і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці.

3.Грамадзянам гарантуецца даступнасць і бясплатнасць дашкольнай, агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

4. Атрыманне адукацыі да 18-гадовага ўзросту або да атрымання агульнай сярэдняй адукацыі абавязковае. Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, забяспечваюць атрыманне дзецьмі адукацыі і маюць права вызначаць характар адукацыі і навучання сваіх дзяцей у адпаведнасці са сваімі рэлігійнымі,

філасофскімі, педагагічнымі поглядамі. Абавязковая частка адукацыі носіць свецкі характар.

5. Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная для ўсіх у адпаведнасці з іх здольнасцямі. Грамадзяне могуць на конкурснай аснове атрымаць адпаведную адукацыю за кошт дзяржаўнага фінансавання.

6. Установы вышэйшай адукацыі маюць акадэмічную свабоду і аўтаномію.

7. Навучэнцы вышэйшых навучальных устаноў маюць права ствараць органы студэнцкага самакіравання.

8. Дзяржава ўстанаўлівае дзяржаўныя адукацыйныя стандарты, падтрымлівае розныя формы адукацыі і самаадукацыі.

9. Дзяржава забяспечвае кожнаму чалавеку магчымасць адукацыі ў галіне правоў чалавека, дэмакратычнай грамадзянскасці, устойлівага развіцця, міжкультурнай разнастайнасці, культуры міру і негвалту.

## *Артыкул 41. Права на ахову здароўя*

1. Грамадзяне маюць права на ахову здароўя, у тым ліку бясплатнае лячэнне ва ўстановах аховы здароўя ва ўстаноўленым законам парадку.

2. Дзяржава ахоўвае здароўе людзей, садзейнічае развіццю медыцыны, яе прафілактычнай накіраванасці, стварае ўмовы для даступнага і кваліфікаванага медыцынскага абслугоўвання.

3. Права на ахову здароўя забяспечваецца таксама развіццём фізічнай культуры і фарміраваннем здаровага ладу жыцця.

## *Артыкул 42. Права на сацыяльнае забеспячэнне, добраахвотнае апякунства*

1. Грамадзяне маюць права на дастойнае сацыяльнае забеспячэнне па ўзросту, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам.

2. Дзяржава прызнае і заахвочвае добраахвотнае служэнне на карысць грамадства, заахвочвае добраахвотнае апякуства, у тым ліку якое ажыццяўляецца некамерцыйнымі арганізацыямі і органамі мясцовага самакіравання.

## *Артыкул 43. Правы асоб з інваліднасцю*

1. Асобам з інваліднасцю гарантуецца ўсялякае садзейнічанне ў ажыццяўленні правоў і свабод чалавека нароўні з іншымі людзьмі, павага ўласцівай чалавеку годнасці, яго асабістай самастойнасці і незалежнасці.

2.Дзяржава забяспечвае людзям з інваліднасцю належныя ўмовы для лячэння, рэабілітацыі, навучання, працаўладкавання, адаптацыі, мабільнасці, даступнасці

аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры і паслуг, разумныя прыстасаванні, якія ўлічваюць індывідуальныя патрэбнасці, прадпрымае неабходныя меры для ўстаранення перашкод на шляху іх паўнацэннага ўдзелу ў жыцці грамадства.

3. Асобам з інваліднасцю, прадстаўнікам іх суполак гарантуецца ўдзел у працэсах прыняцця законаў і праграм, якія закранаюць іх правы.

### *Артыкул 44. Права на жыллё*

1. Кожны чалавек мае права на жыллё. Гэта права забяспечваецца стварэннем умоў для развіцця жыллёвага будаўніцтва, захаванасці жыллёвага фонду і павышэння яго добраўпарадкавання, садзейнічаннем грамадзянам у набыцці жылля.

2. Грамадзянам, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне, жыллё прадастаўляецца дзяржавай і органамі мясцовага самакіравання бясплатна або па даступнай для іх плаце ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жылля.

### *Артыкул 45. Карыстанне дасягненнямі культуры і свабода творчасці*

1. Кожны чалавек мае права на ўдзел у культурным жыцці, у тым ліку права свабодна выказваць, захоўваць і развіваць сваю культурную і моўную самабытнасць.

2. Свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання гарантуецца.

3. Дзяржава прымае меры па захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны народа Беларусі, садзейнічае развіццю культуры, забяспечвае агульнадаступнасць каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, заахвочвае множнасць культурных сродкаў выяўлення і міжкультурны абмен.

### *Артыкул 46. Права на ахову інтэлектуальнай уласнасці*

1. Інтэлектуальная ўласнасць ахоўваецца законам.

2. Асоба, якая з'яўляецца аўтарам, валодае неадчужальным немаёмасным правам на сваю творчасць.

### *Артыкул 47. Права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе*

1. Кожны чалавек мае права на бяспечнае, чыстае, здаровае і ўстойлівае навакольнае асяроддзе.

2. Кожнай асобе гарантуецца права на доступ да экалагічнай інфармацыі і на ўдзел у прыняцці рашэнняў па пытаннях, якія ўплываюць на якасць навакольнага асяроддзя.

3. Дзяржава забяспечвае экалагічную бяспеку, ахову і паляпшэнне навакольнага асяроддзя, абараняе насельніцтва ад надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, прымае меры па пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай катастрофы і абароне пацярпелых ад яе грамадзян.

4. Кожны чалавек абавязаны захоўваць навакольнае асяроддзе і біялагічную разнастайнасць, беражліва адносіцца да прыродных рэсурсаў з улікам інтарэсаў цяперашняга і будучых пакаленняў.

## *Артыкул 48. Абарона суверэнітэту*

1. Грамадзяне маюць права і нясуць абавязак удзельнічаць у абароне незалежнасці, суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы.

2. Кожны чалавек мае права адмовіцца ад вайсковай службы па рэлігійных ці іншых перакананнях і замяніць яе альтэрнатыўнай службай ці вайсковым зборам.

3. Парадак праходжання воінскай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад воінскай службы або замена яе альтэрнатыўнай службай або воінскім зборам, а таксама ажыццяўленне воінскай службы на кантрактнай аснове вызначаюцца законам. Праходжанне воінскай службы не павінна перарываць атрыманне адукацыі і перашкаджаць ажыццяўленню палітычных правоў грамадзян.

4. Узброеныя сілы і іншыя воінскія фарміраванні падпарадкаваны грамадзянскаму кантролю, захоўваюць палітычны нейтралітэт, не могуць быць выкарыстаны для абмежавання мірнага ажыццяўлення правоў і свабод чалавека.

## *Артыкул 49. Права на непадпарадкаванне*

Грамадзяне маюць права на непадпарадкаванне і невыкананне заведама незаконных загадаў і распараджэнняў.

## *Артыкул 50. Абавязкі падаткаплацельшчыка і выкананне заканадаўства*

1. Кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны выконваць яе Канстытуцыю і законы, прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных і мясцовых расходаў шляхам выплаты ўстаноўленых законам падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў.

2. Ніхто не можа быць прымушаны да выканання абавязкаў, якія не прадугледжаны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і яе законамі, або да адмовы ад сваіх правоў.

## *Артыкул 51. Тлумачэнне канстытуцыйных правоў*

1. Ніякае палажэнне гэтай Канстытуцыі не можа быць вытлумачана як такое, што абмяжоўвае або пасягае на правы і свабоды чалавека, прызнаныя нацыянальным заканадаўствам, міжнародным правам і міжнароднымі дагаворамі, у якіх удзельнічае Беларусь.

2.Правы, свабоды і абавязкі, замацаваныя ў Канстытуцыі, распаўсюджваюцца на юрыдычныя асобы ў той меры, у якой гэта адпавядае іх правасуб'ектнасці.

3. Ніякае становішча гэтай Канстытуцыі не можа быць вытлумачана як допушчальнасць выкарыстання сваіх правоў з мэтай прычыніць шкоду іншай асобе, навакольнаму асяроддзю або культурнай спадчыне.

### *Артыкул 52. Абмяжавальныя нормы*

1. Абмежаванне правоў і свабод чалавека дапускаецца толькі ва ўстаноўленым законам парадку ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб і не павінна насіць дыскрымінацыйны характар, скажаць або прымяншаць сутнасць правоў і свабод, якія абмяжоўваюцца, і павінна быць прапарцыйным значэнню абмяжоўваных правоў і свабод, якія абараняюцца Канстытуцыяй каштоўнасцям і мэтам.

2. Абмежаванні, якія дапускаюцца ў пункце 1 гэтага артыкула, не павінны прымяняцца для правоў і свабод чалавека, прадугледжаных артыкуламі 11, 13-19, пунктамі 1 і 2 артыкула 21, 27, пунктам 1 артыкула 28 Канстытуцыі.

### *Артыкул 53. Прыпыненне (абмежаванне) правоў і свабод у надзвычайных сітуацыях*

1. Ажыццяўленне прадугледжаных дадзенай Канстытуцыяй правоў і свабод чалавека можа быць прыпынена або падвергнута дадатковым абмежаванням толькі ва ўмовах ваеннага або надзвычайнага становішча ў парадку і межах, вызначаных Канстытуцыяй і законам, і толькі настолькі, наколькі гэтага патрабуе сітуацыя, у адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі.

2. Пры ажыццяўленні асаблівых мер у перыяд ваеннага або надзвычайнага становішча не могуць прыпыняцца дзеянні артыкулаў 11, 13, 14, пункта 4 артыкула 15, 17, пунктаў 1 і 2 артыкула 21 Канстытуцыі.

---

## ГЛАВА 3. ВЫБАРЫ

### *Артыкул 54. Усеагульнае выбарчае права*

1. Права абіраць маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў.

2. Права быць абраным у дэпутаты, на дзяржаўныя пасады і пасады ў органы мясцовага самакіравання народам вызначаецца сапраўднай Канстытуцыяй і арганічным законам. Гэта права можа быць абмежавана судом для асобы, асуджанай за ўчыненне злачынства, калі пазбаўленне права быць выбраным суразмерна ўчыненаму злачынству і абставінам канкрэтнай справы.

3. Законам могуць быць вызначаны магчымасці і ўмовы ўдзелу замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў выбарах органаў мясцовага самакіравання.

## Артыкул 55. Роўнае выбарчае права

1. Выбаршчыкі маюць роўную колькасць галасоў.

2. Выбарчыя акругі ўтвараюцца з улікам неабходнасці забеспячэння роўнасці вагі галасоў выбаршчыкаў.

3. Кандыдаты ўдзельнічаюць у выбарах на роўных падставах.

## Артыкул 56. Прамое выбарчае права

Прэзідэнт і дэпутаты ўсіх узроўняў абіраюцца грамадзянамі непасрэдна.

## Артыкул 57. Свабодныя выбары

1. Выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць.

2. Кандыдаты і палітычныя партыі праводзяць выбарчую кампанію ў любых формах, не забароненых законам.

3. Забараняецца ажыццяўляць подкуп выбаршчыкаў.

## Артыкул 58. Адкрытасць і галоснасць выбараў

Выбары з'яўляюцца адкрытымі і галоснымі:

падрыхтоўка і правядзенне выбараў ажыццяўляюцца публічна;

інфармацыя аб кандыдатах даступная ў адпаведнасці з законам;

ствараюцца ўмовы для нацыянальнага і міжнароднага назірання;

забяспечваецца поўнае і аператыўнае інфармаванне аб выніках галасавання.

## Артыкул 59. Тайнае галасаванне

Галасаванне на выбарах з'яўляецца тайным. Кантроль волевыяўлення выбаршчыкаў падчас галасавання забараняецца.

## Артыкул 60. Працэсуальныя гарантыі і сістэма абскарджання

1. Працэдура галасавання, падліку галасоў і звесткі вынікаў прадугледжвае абарону ад фальсіфікацый ці маніпуляцый і забяспечвае дакладнае адлюстраванне волі выбаршчыкаў у выніках выбараў.

2. Рашэнне аб прызнанні выбараў сапраўднымі або несапраўднымі можа быць абскарджана ў Вярхоўным Судзе кандыдатамі, палітычнымі партыямі, якія вылучылі кандыдатаў, а таксама выбаршчыкамі ў колькасці не менш за пяць працэнтаў ад колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

## Артыкул 61. Фінансаванне выбараў

1. Расходы на падрыхтоўку і правядзенне выбараў ажыццяўляюцца за кошт дзяржавы, мясцовага самакіравання ў межах сродкаў, спецыяльна выдзеленых на гэтыя мэты. Выдзеленыя сродкі павінны забяспечваць дастатковае і своечасовае фінансаванне выбараў.

2. У парадку, устаноўленым законам, кандыдаты і палітычныя партыі, якія вылучылі кандыдатаў, могуць выкарыстоўваць на правядзенне выбарчай кампаніі ўласныя сродкі і добраахвотныя ўзносы грамадзян.

## Артыкул 62. Арганізацыя выбараў

1. Падрыхтоўка і правядзенне выбараў, садзейнічанне ў рэалізацыі выбарчых правоў грамадзян і кантроль іх захавання забяспечваюць выбарчыя камісіі ў адпаведнасці з кампетэнцыяй, устаноўленай законам.

2. Выбарчыя камісіі пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў незалежныя і дзейнічаюць у адпаведнасці з прынцыпамі празрыстасці, адкрытасці і калегіяльнасці. Умяшанне ў дзейнасць выбарчых камісій з мэтай паўплываць на іх рашэнне, а таксама перашкоды дзейнасці выбарчым камісіям у іншай форме цягнуць за сабой адказнасць па законе.

3. Рашэнні выбарчых камісій, прынятыя ў межах іх кампетэнцыі, абавязковыя для выканаўчых органаў дзяржаўнай улады, выканаўчых органаў мясцовага самакіравання, службовых асоб, выбаршчыкаў, іншых асоб і арганізацый, указаных у законе.

## Артыкул 63. Парадак утварэння Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь

1. Цэнтральная выбарчая камісія Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пастаянна дзейным незалежным калегіяльным органам, на які ўскладаецца функцыя па арганізацыі і правядзенні выбараў і рэферэндумаў у Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з кампетэнцыяй, устаноўленай Канстытуцыяй і арганічным законам.

2. Цэнтральная выбарчая камісія складаецца з 11 сябраў. Партыі, прадстаўленыя ў Сойме, прызначаюць па адным члене ў склад Цэнтральнай выбарчай камісіі ў парадку змяншэння сваёй прадстаўленасці ў парламенце. Калі колькасць партый, прадстаўленых у Сойме, менш за адзінаццаць, то прадстаўленыя ў Сойме партыі ў тым жа парадку прызначаюць дадаткова яшчэ па аднаму сябру Цэнтральнай выбарчай камісіі і так да дасягнення ёю колькасці адзінаццаці сяброў. Тэрмін паўнамоцтваў Цэнтральнай выбарчай камісіі - чатыры гады. Члены Цэнтральнай выбарчай камісіі працуюць на пастаяннай аснове і працягваюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту прызначэння свайго пераемніка.

3. Члены Цэнтральнай выбарчай камісіі выбіраюць са свайго складу тайным галасаваннем старшыню, намесніка старшыні і сакратара Цэнтральнай выбарчай камісіі.

### Артыкул 64. Парадак рэгулявання і стабільнасць выбарчага заканадаўства

1. Цэнтральная выбарчая камісія прызначае дату выбараў Сойму, Прэзідэнта і прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання.

2. Выбары лічацца адбыўшыміся пры любой яўцы грамадзян, якія валодаюць правам абіраць. Прынятце рашэння на выбарах вызначаецца ў адпаведнасці з законам.

3. Выбары не праводзяцца ў перыяд ваеннага або надзвычайнага становішча, калі дзеянне такога становішча распаўсюджваецца на ўсю краіну або большую яе частку.

4. Парадак правядзення выбараў вызначаецца Канстытуцыяй і арганічным законам.

5. Змяненне палажэнняў закона аб выбарах, якія датычацца выбарчых правоў, выбарчай сістэмы, парадку фарміравання і паўнамоцтваў выбарчых камісій, прымаецца Соймам у двух наступных складах, падзеленых чарговымі выбарамі ў Сойм. У дадзеным выпадку закон лічыцца прынятым, калі наступны склад Сойма ў першым і адзіным чытанні прагаласуе за яго прынятце без змен.

6. Закон аб правядзенні выбараў не можа быць зменены ва ўмовах ваеннага ці надзвычайнага становішча, а таксама за апошнія шэсць месяцаў да правядзення чарговых выбараў.

---

## ГЛАВА 4. РЭФЕРЭНДУМ

### Артыкул 65. Прынцыпы правядзення рэферэндумаў

1. Для вырашэння грамадска значных пытанняў могуць праводзіцца нацыянальныя і мясцовыя рэферэндумы (народнае галасаванне).

2. Рэферэндумы праводзяцца шляхам усеагульнага, свабоднага, роўнага і тайнага галасавання. Усе канстытуцыйныя гарантыі, якія адносяцца да выбараў, прымяняюцца адносна рэферэндумаў.

3. У рэферэндумах удзельнічаюць грамадзяне, якія валодаюць правам абіраць.

4. Пытанне, якое выносіцца на рэферэндум, павінна быць сфармулявана такім чынам, каб выключалася множнасць яго тлумачэнняў, на яго можна было даць толькі адназначны адказ і выключалася нявызначанасць прававых наступстваў.

### Артыкул 66. Нацыянальныя рэферэндумы

1. Нацыянальныя рэферэндумы прызначаюцца Цэнтральнай выбарчай камісіяй па прапанове Сойму або па ініцыятыве не менш за 250 тысяч грамадзян, якія

валодаюць правам абіраць, з тэрытарыяльным прадстаўніцтвам, вызначаным законам.

2. Канстытуцыйнасць фармулёвак пытанняў, якія выносяцца на нацыянальны рэферэндум, правяраецца Канстытуцыйным судом да правядзення рэферэндуму.

3. Юрыдычная сіла рашэння, якое прымаецца на нацыянальным рэферэндуме, - кансультатыўнае або якое абавязвае - вызначаецца пры прызначэнні рэферэндуму ў адпаведнасці з умовамі, вызначанымі законам, прапановай ініцыятара рэферэндуму і заключэннем Канстытуцыйнага суда.

4. На нацыянальны рэферэндум не выносяцца пытанні, якія могуць пацягнуць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, пытанні аб прыняцці і аб змяненні бюджэту, устанаўленні, змяненні і адмене падаткаў, збораў (пошлін), аб амністыі і памілаванні, аб выбранні і вызваленні службовых асоб, іншыя пытанні, вызначаныя Канстытуцыяй ці арганічным законам.

## *Артыкул 67. Мясцовыя рэферэндумы*

1. Мясцовыя рэферэндумы прызначаюцца адпаведнымі прадстаўнічымі органамі мясцовага самакіравання па сваёй ініцыятыве або па прапанове не менш за пяць працэнтаў грамадзян, якія валодаюць правам абіраць і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

2. На мясцовы рэферэндум з юрыдычнай сілай, якая абавязвае, не могуць выносіцца пытанні, аднесеныя да выключнай кампетэнцыі прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання, і іншыя пытанні, вызначаныя арганічным законам.

## *Артыкул 68. Парадак правядзення рэферэндумаў*

1. Парадак правядзення нацыянальных і мясцовых рэферэндумаў вызначаецца арганічным законам.

2. Законам устанаўліваюцца падставы для правядзення абавязковага рэферэндуму. Рэферэндум па змяненні Канстытуцыі праводзіцца выключна ў адпаведнасці з працэдурай, прадугледжанай у главе 18 Канстытуцыі.

3. Рашэнне аб прызначэнні або аб адмове ў прызначэнні рэферэндуму можа быць абскарджана ў судзе ініцыятыўнай групай грамадзян па правядзенні рэферэндуму, або не менш як адной пятай ад канстытуцыйнага складу Сойма для нацыянальнага рэферэндуму і адной пятай ад ліку абраных дэпутатаў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання для мясцовага рэферэндуму. .

4. Рэферэндум лічыцца адбыўшымся пры любой яўцы грамадзян, якія валодаюць правам абіраць. Рашэнне лічыцца прынятым на рэферэндуме, калі за яго прагаласавала больш за палову грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Прыняцце рашэння на рэферэндуме па пытанні змянення Канстытуцыі вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 160 Канстытуцыі.

5. Правядзенне паўторнага рэферэндуму па адным і тым жа пытанні не дапускаецца на працягу двух гадоў з дня афіцыйнага апублікавання яго вынікаў.

# ГЛАВА 5. СОЙМ

## *Артыкул 69. Статус Сойма*

Сойм - парламент - з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.

## *Артыкул 70. Склад і выбары*

1. Сойм складаецца з 220 дэпутатаў, якія выбіраюцца ў адпаведнасці з законам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

2. Дэпутатам Сойму можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае правам абіраць і дасягнуў 21 года.

3. Чарговыя выбары Сойма праводзяцца ў другую нядзелю красавіка апошняга поўнага каляндарнага года паўнамоцтваў Сойма.

4. Выбары дэпутатаў Сойма праводзяцца на аснове прапарцыйнага прадстаўніцтва па шматмандатных выбарчых акругах, размешчаных на вызначаным у законе тэрытарыяльным узроўні адзінак мясцовага самакіравання.

5. Сойм лічыцца правамоцным, калі ў яго абрана не менш за дзве трэція канстытуцыйнага складу Сойма.

## *Артыкул 71. Тэрмін паўнамоцтваў*

1. Тэрмін паўнамоцтваў Сойма - чатыры гады.

2. Пачаткам тэрміна паўнамоцтваў Сойма з'яўляецца першае пасяджэнне зноў абранага складу Сойма.

3. Паўнамоцтвы Сойма захоўваюцца да адкрыцця першага пасяджэння Сойма новага склікання.

## *Артыкул 72. Датэрміновыя выбары*

1. Сойм большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад канстытуцыйнага складу можа прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах Сойма.

2. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах Сойма ў выпадках, прадугледжаных пунктам 5 артыкула 102 Канстытуцыі.

3. Датэрміновыя выбары Сойма не могуць прызначацца:

3.1. у перыяд ваеннага або надзвычайнага становішча, уведзенага ў Рэспубліцы Беларусь;

3.2. у апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

3.3. у перыяд вырашэння пытання Соймам аб датэрміновым вызваленні або зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Датэрміновыя выбары Сойму павінны быць праведзены не пазней за тры месяцы пасля прыняцця рашэння аб датэрміновых выбарах. Дату датэрміновых выбараў Сойма прызначае Цэнтральная выбарчая камісія на працягу дзесяці дзён з моманту прыняцця рашэння аб датэрміновых выбарах Сойма.

## *Артыкул 73. Незалежнасць дэпутата*

1. Дэпутат Сойму знаходзіцца на службе ўсяго народа, а не толькі тых, хто яго абраў. Ён не звязаны ўказаннямі, кіруецца сваім сумленнем і перакананнямі, і не можа быць адкліканы.

2. Дэпутаты Сойму працуюць на пастаяннай аснове і атрымліваюць узнагароду ў памеры, устаноўленым законам.

## *Артыкул 74. Несумяшчальнасць*

Дэпутат Сойму не можа быць дэпутатам прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання, займаць пасаду Прэзідэнта, суддзі, якую-небудзь іншую аплатную пасаду, не можа весці прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з атрыманнем выгады з маёмасці дзяржавы або адзінак мясцовага самакіравання. Патрабаванні адносна несумяшчальнасці дэпутацкага мандата з іншымі відамі дзейнасці ўстанаўліваюцца законам.

## *Артыкул 75. Спыненне паўнамоцтваў*

1. Паўнамоцтвы дэпутата Сойма спыняюцца ў выпадку:

1.1. спынення паўнамоцтваў дадзенага складу Сойма;

1.2. пры складанні паўнамоцтваў на падставе асабістай заявы;

1.3. пазбаўлення мандата на аснове закона рашэннем суда пры заняцці пасады або ажыццяўленні дзейнасці, несумяшчальнай са статусам дэпутата Сойма;

1.4. пазбаўленне мандата рашэннем, прынятым большасцю не менш як тры пятыя галасы ад канстытуцыйнага складу Сойма, пры адсутнасці дэпутата па непаважлівай прычыне больш чым на палове чарговых пасяджэнняў у рамках адной сесіі;

1.5. страты права абіраць або быць абраным.

2. Кожны раз, калі месца дэпутата Сойма становіцца вакантным, вакансія павінна быць запоўнена спосабам, прадугледжаным законам.

## Артыкул 76. Недатыкальнасць дэпутата

1. Дэпутат Сойму пры выкананні паўнамоцтваў не нясе юрыдычнай адказнасці за свае выказванні, галасаванне і дзейнасць, за выключэннем адказнасці за абразу або паклёп.

2. Дэпутат Сойма не можа быць арыштаваны, іншым чынам пазбаўлены асабістай свабоды без згоды Сойма, прынятай большасцю не менш як дзве трэці галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма, акрамя выпадкаў затрымання на месцы ўчынення ім цяжкага злачынства.

3. Крымінальная справа супраць дэпутата Сойма можа быць узбуджана выключна Генеральным пракурорам.

## Артыкул 77. Сесіі і пасяджэнні

1. Сойм рэгулярна збіраецца на сесіі і пасяджэнні ва ўстаноўленым Рэгламентам Сойма парадку.

2. Па патрабаванні Старшыні Сойма, Урада або не менш за адну чацвёртую ад канстытуцыйнага складу дэпутатаў Сойма склікаецца пазачарговая сесія, а пад час чарговай сесіі - пазачарговае пасяджэнне. Пазачарговае пасяджэнне Сойма праводзіцца толькі па парадку дня, вызначаным ініцыятарам, і закрываецца з яго вычарпаннем.

3. У выпадку аб'яўлення ваеннага або надзвычайнага становішча Сойм на працягу 24 гадзін збіраецца на пазачарговую сесію, якая працягваецца да адмены названага становішча.

4. Пасяджэнні Сойма лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел больш за палову ад канстытуцыйнага складу Сойма.

5. Пасяджэнні Сойма праводзяцца адкрыта і галосна. Сойм большасцю не менш як тры пятыя галасы ад канстытуцыйнага складу можа прыняць рашэнне аб правядзенні закрытага пасяджэння. На закрытым пасяджэнні не могуць прымацца законы і пастановы Сойма.

6. Першае пасля выбараў пасяджэнне Сойма склікаецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй не пазней за 30 дзён з дня абвяшчэння канчатковых вынікаў выбараў.

7. Першае пасяджэнне Сойма адкрывае найстарэйшы па ўзросце дэпутат.

## Артыкул 78. Старшыня і намеснік Старшыні Сойма

1. Сойм на тэрмін паўнамоцтваў з ліку дэпутатаў Сойма абірае Старшыню Сойма і яго намесніка.

2. Старшыня Сойма і яго намеснік абіраюцца тайным галасаваннем большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу Сойма. Старшыня Сойма падсправаздачны Сойму.

3. Старшыня Сойма ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва дзейнасцю Сойма і прадстаўляе Сойм у адносінах з іншымі органамі і арганізацыямі. Намеснік Старшыні Сойма выконвае па даручэнні Старшыні Сойма асобныя яго абавязкі і замяшчае Старшыню Сойма ў выпадку яго адсутнасці або немагчымасці ажыццяўлення ім сваіх абавязкаў.

## *Артыкул 79. Прэзідыум, камісіі і фракцыі*

1. Сойм з ліку дэпутатаў абірае пастаянныя камісіі і іншыя органы для вядзення законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да вядзення Сойма, ажыццяўленне кантролю за выкананнем законаў і пастаноў.

2. Дэпутаты могуць аб'ядноўвацца ў парламенцкія фракцыі. Парадак стварэння і дзейнасці фракцыі, яе правы вызначаюцца Рэгламентам Сойма.

3. Для арганізацыі работы Сойма ствараецца Прэзідыум, у склад якога ўваходзяць Старшыня Сойма і яго намеснік, старшыні пастаянных камісій і кіраўнікі фракцый. Прэзідыум Сойма ўзначальвае Старшыня Сойма.

4. У выпадках, прадугледжаных Рэгламентам Сойма, а таксама па патрабаванні не менш за адну чацвёртую ад канстытуцыйнага складу Сойма, у парламенце ствараюцца следчая або іншыя часовыя камісіі. У часовай камісіі кожная фракцыя мае права быць прадстаўленай сама не менш адным членам.

## *Артыкул 80. Зварот і інтэрпеляцыя*

1. Дэпутат, а таксама парламенцкая камісія маюць права звярнуцца з пытаннем або зваротам да службовых асоб Урада, іншых дзяржаўных органаў, а таксама дзяржаўных устаноў і арганізацый незалежна ад іх падпарадкаванасці, якія абавязаны ім адказаць.

2. Парламенцкая фракцыя, камісія або група дэпутатаў у складзе не менш як адной пятай ад канстытуцыйнага складу Сойма мае права ў парадку інтэрпеляцыі звярнуцца з запытам да Урада або члена Урада, якія абавязаны адказаць на пастаўлены запыт на плянарным пасяджэнні Сойма.

## *Артыкул 81. Віды законаў*

1. Сойм прымае канстытуцыйныя, арганічныя і ардынарныя законы.

2. Канстытуцыйныя законы - гэта законы па змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі.

3. Арганічным законам рэгламентуюцца:

3.1. грамадзянства, статус іншаземцаў і асоб без грамадзянства;

3.2. арганізацыя і правядзенне выбараў і рэферэндумаў;

3.3. арганізацыя і дзейнасць Сойма;

3.4. парадак ажыццяўлення паўнамоцтваў Прэзідэнта;

3.5. арганізацыя і дзейнасць Урада;

3.6. судаўпарадкаванне і статус суддзяў, судаводства, арганізацыя і дзейнасць Канстытуцыйнага Суда, пракуратуры, арганізацыя і дзейнасць адвакатуры;

3.7. асновы мясцовага самакіравання;

3.8. адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне Рэспублікі Беларусь;

3.9. эталоннае апісанне і парадак выкарыстання дзяржаўных сімвалаў, статус горада Мінска, парадак прымянення дзяржаўных моў;

3.10. арганізацыя і дзейнасць палітычных партый, грамадскіх і рэлігійных арганізацый, прафесійных саюзаў;

3.11. асновы нацыянальнай бяспекі, арганізацыі Узброеных Сіл і забеспячэнні грамадскага парадку; ваеннае і надзвычайнае становішча;

3.12. іншыя сферы, па якіх Канстытуцыяй прадугледжана прыняцце арганічных законаў;

3.13. іншыя сферы, па якіх Соймам прызнана неабходным прыняцце арганічных законаў.

4. Ардынарныя законы дзейнічаюць ва ўсіх сферах грамадскіх адносін, за выключэннем сфер, якія рэгулююцца канстытуцыйнымі і арганічнымі законамі.

## *Артыкул 82. Міжнародныя дагаворы*

1. Сойм большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу ратыфікуе, дэнансуе, прыпыняе дзеянне і анулюе міжнародныя дагаворы, заключаныя Рэспублікай Беларусь. У выпадку падачы ў Канстытуцыйны Суд прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці міжнароднага дагавора ў адпаведнасці з пунктам падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 128 Канстытуцыі, ратыфікацыя адпаведнага міжнароднага дагавора не дапускаецца да вынясення рашэння Канстытуцыйнага Суда.

2. Ратыфікацыі Соймам падлягаюць міжнародныя дамовы:

2.1. якія прадугледжваюць ратыфікацыю, як адзіны спосаб выказвання згоды на абавязковасць такой дамовы;

2.2. якія маюць палітычны або ваенны характар;

2.3. датычныя асноўных правоў і свабод чалавека;

2.4. якія разглядаюць тэрытарыяльнае размежаванне Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі;

2.5. якія патрабуюць змянення або прыняцця законаў, неабходных для выканання прынятых міжнародных абавязацельстваў;

2.6. якія накладаюць значныя фінансавыя абцяжаранні на дзяржаву;

2.7. якія ўстанаўліваюць удзел Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях і міждзяржаўных утварэннях.

## *Артыкул 83. Заканадаўчая ініцыятыва і права ўносіць прапановы*

1. Правам заканадаўчай ініцыятывы валодаюць:

1.1. дэпутаты;

1.2. Урад;

1.3 грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць правам абіраць, у колькасці не менш за 25 тысяч чалавек.

2. Дэпутаты, парламенцкія камісіі і фракцыі маюць права ўносіць прапановы па любым пытанні, якое абмяркоўваецца.

3. Парадак унясення на разгляд Сойма прапаноў, праектаў законаў і паправак да іх вызначаецца Рэгламентам Сойма.

## *Артыкул 84. Разгляд пытанняў на пленарным пасяджэнні*

1. Разгляд праектаў законаў ажыццяўляецца ў трох чытаннях падчас трох розных пасяджэнняў, аддзеленых адзін ад аднаго, па меншай меры, двухдзённым інтэрвалам, калі іншае не прадугледжана Рэгламентам Сойма. Абмеркаванне праектаў законаў уключае разгляд агульнай канцэпцыі, пастатэйна і ў цэлым. Разгляду праектаў законаў на плянарным пасяджэнні павінен папярэднічаць удзел грамадскасці ў кансультацыях, для якіх даецца дастаткова часу для падрыхтоўкі і прадстаўлення рэкамендацый па законапраектах.

2. Іншыя пытанні разглядаюцца на пленарным пасяджэнні ў аднаразовым чытанні.

3. Сойм можа па ініцыятыве парламенцкай камісіі, фракцыі або Урада ва ўмовах ваеннага або надзвычайнага становішча, а таксама іншых сітуацыях, калі гэта аб'ектыўна неабходна, аб'явіць аб паскоранай працэдуры праходжання якога-небудзь праекта закона або пастановы, за выключэннем праекта канстытуцыйнага або арганічнага закона.

4. Заканадаўства аб ваенным і надзвычайным становішчы не можа быць зменена ва ўмовах ваеннага або надзвычайнага становішча.

## *Артыкул 85. Галасаванне*

1. Галасаванне на пасяджэннях Сойма ажыццяўляецца дэпутатамі асабіста. Галасаванне за іншага дэпутата прыводзіць да прымянення да дэпутата ўстаноўленых законам мер адказнасці.

2. Ардынарны закон лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць ад тых, хто прыняў удзел у галасаванні, але не менш за адну трэць ад

канстытуцыйнага складу Сойма. Арганічны закон лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць ад канстытуцыйнага складу Сойма, пры ўмове, што Канстытуцыяй не вызначаны іншы парадак прыняцця арганічнага закону. Канстытуцыйны закон прымаецца ў парадку, устаноўленым главой 18 Канстытуцыі.

3. Пастановы і іншыя рашэнні Сойма лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала большасць ад дэпутатаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, пры ўмове, што Канстытуцыяй або Рэгламентам Сойма не вызначана іншае.

## *Артыкул 86. Падпісанне і апублікаванне закона*

1. Прынятыя законы ў двухтыднёвы тэрмін з дня прыняцця накіроўваюцца Старшынёй Сойму на подпіс прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

2. Прэзідэнт у двухтыднёвы тэрмін падпісвае і афіцыйна публікуе закон на кожнай з дзяржаўных моў або вяртае яго ў Сойм не падпісаным са сваімі заўвагамі і прапановамі.

3. Калі закон на працягу двух тыдняў не вяртаецца Прэзідэнтам у Сойм для паўторнага разгляду, ён лічыцца падпісаным і публікуецца па рашэнні Старшыні Сойма.

4. Калі Сойм на працягу трыццаці дзён з дня вяртання непадпісанага закона Прэзідэнтам прагаласуе за яго прыняцце ў першапачатковай рэдакцыі большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу Сойма, закон лічыцца прынятым, падпісваецца Старшынёй Сойма і публікуецца па яго рашэнні ў пяцідзённы тэрмін.

5. Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён з дня яго афіцыйнага апублікавання, калі іншае не прадугледжана самім законам, але не раней за дзень яго апублікавання.

6. Закон не мае зваротнай сілы, за выключэннем выпадкаў, калі ён змякчае або адмяняе адказнасць грамадзян.

## *Артыкул 87. Паўнамоцтвы Сойма*

1. Сойм:

1.1. прымае і змяняе Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым у главе 18 Канстытуцыі;

1.2. прымае нарматыўныя прававыя акты: законы і пастановы.

2. Сойм большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу зацвярджае, адмяняе або прадаўжае дзеянне ўказа Прэзідэнта аб увядзенні ў краіне ваеннага становішча, поўнай або частковай мабілізацыі ваеннаабавязаных, а таксама пастановы Урада аб увядзенні надзвычайнага становішча. Падаўжэнне тэрміна дзеяння надзвычайнага становішча можа мець месца толькі адзін раз.

3. Сойм у сферы прызначэнняў на пасаду і вызваленняў ад пасады вышэйшых службовых асоб большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй:

3.1. прызначае Прэм'ер-міністра ў парадку артыкула 102 Канстытуцыі, прымае адстаўку Прэм'ер-міністра, выказвае яму недавер у парадку артыкула 103 Канстытуцыі;

3.2.выказвае давер або недавер Ураду ў парадку артыкула 103 Канстытуцыі, прымае адстаўку Урада;

3.3. па прадстаўленні Прэзідэнта, Старшыні Сойма, Старшыні Вярхоўнага Суда прызначае суддзяў Канстытуцыйнага Суда ў парадку артыкула 127 Канстытуцыі;

3.4. па прадстаўленні Прэзідэнта прызначае Генеральнага пракурора, Старшыню Праўлення Нацыянальнага банка і вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам;

3.5. па прадстаўленні Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка прызначае членаў Праўлення Нацыянальнага банка і вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам;

3.6. па прадстаўленні профільных камісій парламента прызначае Старшыню і чальцоў Кантрольнай палаты, Старшыні і чальцоў Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў выведкі і бяспекі і вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам;

3.7. па прадстаўленні конкурснай камісіі прызначае Упаўнаважанага па правах чалавека, Старшыню і членаў Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі і вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам;

3.8. прымае рашэнне аб датэрміновым вызваленні ад пасады або зняцці з пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у парадку артыкула 92 Канстытуцыі;

3.9. прызначае і вызваляе ад пасады іншых вышэйшых службовых асоб, устаноўленых законам.

4. Сойм большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу прымае рашэнне аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з артыкулам 118 Канстытуцыі.

5. Ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю Урада, іншых органаў і службовых асоб, падсправаздачных Сойма, за выкананнем законаў і пастаноў.

6. У выпадку неабходнасці Сойм законам стварае незалежныя дзяржаўныя органы кіравання, нагляду або кантролю, якія не ўваходзяць у сістэму выканаўчай улады.

7. Сойм праводзіць у адпаведнасці з Рэгламентам Сойма вывучэнне і абмеркаванне любых пытанняў, якія ўяўляюць грамадскую цікавасць, вырашае іншыя пытанні, аднесеныя Канстытуцыяй да кампетэнцыі Сойма.

### Артыкул 88. Парадак дзейнасці

Парадак дзейнасці Сойма, яго органаў і дэпутатаў вызначаецца Канстытуцыяй і Рэгламентам Сойма. Рэгламент Сойму мае сілу закону, прымаецца па працэдуры арганічнага закону і падпісваецца Старшынёй Сойма. Палажэнні Рэгламенту Сойма павінны быць складзены такім чынам, каб забяспечыць удзел кожнай фракцыі ва ўсіх справах Сойма прапарцыйна колькасці яе чальцоў.

## ГЛАВА 6. ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 89. Статус Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца кіраўніком дзяржавы.

2. Прэзідэнт з'яўляецца Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь.

3. Прэзідэнт прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.

### Артыкул 90. Выбары Прэзідэнта

1. Прэзідэнт выбіраецца на пяць гадоў народам Рэспублікі Беларусь на падставе ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

2. Прэзідэнтам можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам. Адна і тая ж асоба не можа быць Прэзідэнтам больш за два тэрміны на працягу свайго жыцця.

3. Кандыдаты на пасаду Прэзідэнта вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў у парадку, устаноўленым законам, а таксама палітычнымі партыямі, якія маюць фракцыю ў Сойме.

4. Чарговыя выбары Прэзідэнта праводзяцца ў апошнюю нядзелю кастрычніка апошняга поўнага каляндарнага года паўнамоцтваў Прэзідэнта.

5. Калі пасада Прэзідэнта аказалася вакантнай, выбары павінны быць праведзены не пазней трох месяцаў з дня адкрыцця вакансіі. Дату датэрміновых выбараў Прэзідэнта прызначае Цэнтральная выбарчая камісія на працягу дзесяці дзён з дня адкрыцця вакансіі.

6. Прэзідэнт лічыцца абраным, калі за яго прагаласавала больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

7. Калі ніводзін з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў, то ў двухтыднёвы тэрмін праводзіцца другі тур галасавання па двух кандыдатах, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў. Абраным лічыцца кандыдат у Прэзідэнты, які атрымаў у другім туры галасавання найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

8. Калі ў першым туры прынялі ўдзел два кандыдаты абраным лічыцца кандыдат у Прэзідэнты, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

9. Калі на пасаду Прэзідэнта вылучаны толькі адзін кандыдат і за яго прагаласавала менш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прынялі ўдзел у галасаванні, праводзяцца паўторныя выбары.

10. Парадак правядзення выбараў Прэзідэнта вызначаецца арганічным законам.

## *Артыкул 91. Прысяга Прэзідэнта і тэрмін паўнамоцтваў*

1. Прэзідэнт уступае ў пасаду пасля прынясення Прысягі наступнага зместу: "Уступаючы на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, урачыста клянуся верна служыць народу Беларусі, паважаць і ахоўваць правы і свабоды чалавека, выконваць і абараняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, свята і добрасумленна выконваць ускладзеныя на мяне высокія абавязкі. Жыве Беларусь!".

2. Прысяга прыносіцца на беларускай мове ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці дэпутатаў Сойма, суддзяў Канстытуцыйнага Суда і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі і не пазней як за 30 дзён з дня аб'яўлення канчатковых вынікаў выбараў Прэзідэнта. Дату прынясення Прысягі прызначае Цэнтральная выбарчая камісія.

3. З моманту прынясення Прысягі нававыбраным Прэзідэнтам паўнамоцтвы папярэдняга Прэзідэнта спыняюцца.

4. Прыняцце Прысягі з'яўляецца пачаткам тэрміна паўнамоцтваў Прэзідэнта.

## *Артыкул 92. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў*

1. Прэзідэнт можа ў любы час падаць у адстаўку. Адстаўка ўступае ў сілу з моманту падачы заявы ў Сойм.

2. У выпадку адстаўкі Прэзідэнта ён не мае права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта або Сойму на працягу пяці гадоў пасля адстаўкі.

3. Прэзідэнт можа быць датэрмінова вызвалены ад пасады пры стойкай няздольнасці па стане здароўя выконваць свае абавязкі. Рашэнне аб датэрміновым вызваленні Прэзідэнта ад пасады прымаецца большасцю не менш як дзве трэці галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма на падставе заключэння спецыяльна створанай камісіі.

4. Прэзідэнт можа быць зняты з пасады за парушэнне ім Прысягі або ўчыненне злачынства. Пытанне аб зняцці Прэзідэнта можа быць пастаўлена па прапанове не менш як адной трэці дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма і павінна быць падтрымана большасцю не менш як дзве трэці галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма. Канчатковае рашэнне аб зняцці Прэзідэнта з пасады прымаецца большасцю не менш як дзве трэці галасоў суддзяў ад поўнага складу Канстытуцыйнага Суда.

5. У выпадку зняцця Прэзідэнта з пасады ён пазбаўляецца права займаць выбарныя дзяржаўныя пасады на працягу наступных дзесяці гадоў.

### *Артыкул 93. Вакансія пасады*

У выпадку вакансіі пасады Прэзідэнта, немагчымасці выканання ім сваіх абавязкаў па падставах, прадугледжаных Канстытуцыяй, яго паўнамоцтвы да прынясення Прысягі нававыбраным Прэзідэнтам выконвае Старшыня Сойму. У гэтым выпадку паўнамоцтвы Старшыні Сойма пераходзяць да намесніка Старшыні Сойма.

### *Артыкул 94. Несумяшчальнасць і недатыкальнасць*

1. Прэзідэнт не можа займаць іншыя аплатныя пасады і весці прадпрымальніцкую дзейнасць.

2. Прэзідэнт прыпыняе сяброўства ў палітычных партыях.

3. Прэзідэнт мае недатыкальнасць на час выканання паўнамоцтваў. У перыяд знаходжання на пасадзе не дапускаецца арышт і прыцягненне да крымінальнай адказнасці асобы Прэзідэнта.

### *Артыкул 95. Паўнамоцтвы Прэзідэнта*

1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь:

1.1. прадстаўляе Сойму кандыдатуру Прэм'ер-міністра ў парадку, устаноўленым артыкулам 102 Канстытуцыі; прызначае на пасаду Прэм'ер-міністра ў выпадку, прадугледжаным пунктам 5 артыкула 102 Канстытуцыі; прызначае часова выконваючага абавязкі Прэм'ер-міністра ў выпадках, прадугледжаных пунктам 8 артыкула 103 Канстытуцыі;

1.2. прадстаўляе Сойму кандыдатуры на пасаду Генеральнага пракурора, Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка;

1.3. падпісвае законы Рэспублікі Беларусь; у парадку, устаноўленым Канстытуцыяй, мае права вярнуць закон са сваімі заўвагамі і прапановамі ў Сойм;

1.4. падпісвае міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусь;

1.5. прымае рашэнне аб датэрміновых выбарах Сойма ў выпадках, прадугледжаных пунктам 5 артыкула 102 Канстытуцыі;

1.6. штогод звяртаецца да Сойма і народа Беларусі з пасланнем аб становішчы краіны; мае права ўдзельнічаць у пасяджэннях Сойма і яго органаў;

1.7. вырашае пытанні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь і яго спыненні;

1.8. ажыццяўляе памілаванне або змякчэнне пакарання асуджаных;

1.9. узнагароджвае дзяржаўнымі ўзнагародамі;

1.10. уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку ваеннай пагрозы або нападу ваеннае становішча, аб'яўляе поўную або частковую мабілізацыю з унясеннем прынятага рашэння на разгляд Сойма на працягу двух каляндарных дзён;

1.11. фармуе Офіс Прэзідэнта, які забяспечвае яго дзейнасць.

2. Па прадстаўленні Урада Прэзідэнт:

2.1. прызначае і адклікае дыпламатычных прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах і пры міжнародных арганізацыях; прымае даверчыя і адзыўныя граматы дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый; прысвойвае вышэйшыя дыпламатычныя рангі і спецыяльныя званні;

2.2. прызначае на пасады і вызваляе ад пасад вышэйшае камандаванне Узброеных Сіл;

2.3. прызначае іншых службовых асоб, якія вызначаны законам;

2.4. прысвойвае вышэйшыя воінскія званні;

2.5. прысвойвае класныя чыны, званні.

3. Сумесна з Урадам у выпадках, вызначаных законам, прэзідэнт:

3.1. прымае меры па абароне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці;

3.2. вырашае пытанні знешняй палітыкі.

4. Прэзідэнт ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, ускладзеныя на яго Канстытуцыяй.

## *Артыкул 96. Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь*

1. Прэзідэнт у адпаведнасці з законам фарміруе склад і ўзначальвае Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь, які каардынуе дзейнасць органаў дзяржаўнай улады ў сферы нацыянальнай бяспекі і абароны.

2. У склад Савета Бяспекі па пасадзе ўваходзяць Старшыня Сойму, Прэм'ер-міністр, міністры абароны, унутраных і замежных спраў, кіраўнікі профільных парламенцкіх камісій і іншыя асобы, вызначаныя законам.

3. Парадак утварэння, дзейнасці і паўнамоцтвы Савета Бяспекі ўстанаўліваюцца законам.

## *Артыкул 97. Акты Прэзідэнта і кантрасігнатура*

1. Прэзідэнт для рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі выдае ўказы, якія з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі і маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і распараджэнні.

2. Указы і распараджэнні Прэзідэнта не павінны супярэчыць Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

3. Для надання юрыдычнай сілы ўказам Прэзідэнта яны павінны быць падпісаны Прэм'ер-міністрам. Кантрасігнатура не патрабуецца ў выпадку з указамі Прэзідэнта, звязанымі з рэалізацыяй выключных паўнамоцтваў у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 95 Канстытуцыі.

4. Указ Прэзідэнта ўступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання, калі іншае не прадугледжана самім указам, але не раней за дзень яго апублікавання.

5. Калі ў час ваеннага становішча Сойм не можа сабрацца на пасяджэнне, Прэзідэнт па прапанове Урада выдае дэкрэты з сілай закона ў аб'ёме і ў межах, вызначаных Канстытуцыяй і Законам. Гэтыя дэкрэты падлягаюць зацвярджэнню Соймам на бліжэйшым пасяджэнні. Дэкрэты з сілай закона, не зацверджаныя Соймам, спыняюць сваё дзеянне праз 90 дзён або з заканчэннем ваеннага становішча, у залежнасці ад таго, якая падзея наступіць раней.

### *Артыкул 98. Парадак ажыццяўлення паўнамоцтваў*

Парадак ажыццяўлення Прэзідэнтам сваіх паўнамоцтваў, а таксама фінансавае, матэрыяльнае і іншае забеспячэнне Прэзідэнта вызначаюцца арганічным законам.

---

## ГЛАВА 7. УРАД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### *Артыкул 99. Статус і падсправаздачнасць Урада*

1. Урад Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшым калегіяльным органам выканаўчай улады.

2. Урад падсправаздачны і нясе адказнасць за сваю дзейнасць перад Соймам.

### *Артыкул 100. Склад Урада*

1. Урад складаецца з Прэм'ер-міністра, яго намеснікаў і міністраў.

2. Працай Урада кіруе Прэм'ер-міністр.

3. Прэм'ер-міністр і намеснікі Прэм'ер-міністра могуць таксама выконваць функцыі міністра.

4. Намеснікі Прэм'ер-міністра замяшчаюць Прэм'ер-міністра ў яго адсутнасць або ў выпадку немагчымасці ім выконваць свае абавязкі. Парадак замяшчэння ўстанаўлівае Прэм'ер-міністр, а ў выпадку адсутнасці такога прадстаўлення Прэзідэнт даручае аднаму з членаў Урада замяшчаць Прэм'ер-міністра на тэрмін не больш як 60 дзён.

5. Кожны міністр у выпадку адсутнасці або часовай няздольнасці выконваць свае абавязкі, замяшчаецца сваім намеснікам, чыя кандыдатура зацверджана Прэм'ер-міністрам, або, калі такое зацвярджэнне адсутнічае, членам Урада, якога прызначыць Прэм'ер-міністр.

6. Структура, парадак арганізацыі і дзейнасці Урада вызначаюцца арганічным законам.

## *Артыкул 101. Несумяшчальнасць, імунітэт і адказнасць члена Урада*

1. Член Урада не можа займаць іншыя пасады, якія аплачваюцца, весці прадпрымальніцкую дзейнасць, уваходзіць у праўленне або ў савет камерцыйнай арганізацыі. Закон можа вызначыць іншыя віды дзейнасці, якія член урада не можа ажыццяўляць.

2. Член Урада нясе адказнасць за законнасць ажыццяўляемых ім службовых дзеянняў.

3. Член Урада не можа быць арыштаваны, іншым чынам пазбаўлены асабістай свабоды без згоды Сойма, акрамя выпадкаў затрымання на месцы ўчынення ім цяжкага злачынства.

4. Крымінальная справа супраць члена Урада можа быць узбуджана выключна Генеральным пракурорам.

5. Пры ўзбуджэнні крымінальнай справы супраць члена Урада і прад'яўленні яму афіцыйнага абвінавачання Прэм'ер-міністр выносіць рашэнне аб тым, ці будзе гэты член Урада часова вызвалены ад сваіх абавязкаў.

## *Артыкул 102. Прызначэнне Прэм'ер-міністра*

1. Кандыдатура на пасаду Прэм'ер-міністра, прапанаваная парламенцкай фракцыяй або кааліцыяй фракцый, якія маюць найбольшую колькасць дэпутатаў у сваім складзе, уносіцца ў Сойм Прэзідэнтам пасля кансультацый з кіраўнікамі парламенцкіх фракцый не пазней за адзін месяц з дня адстаўкі Прэм'ер-міністра. Кандыдат на пасаду Прэм'ер-міністра прадстаўляе Сойму новы склад Урада і праграму Урада. Рашэнне аб зацвярджэнні Прэм'ер-міністра на пасадзе прымаецца Соймам не пазней за двухтыднёвы тэрмін з дня ўнясення прапановы Прэзідэнтам.

2. Калі прадстаўленая Прэзідэнтам кандыдатура на пасаду Прэм'ер-міністра не атрымае падтрымкі дэпутатаў Сойма, Прэзідэнт у сямідзённы тэрмін прадстаўляе іншую або тую ж кандыдатуру, рашэнне аб зацвярджэнні якой прымаецца на працягу сямі каляндарных дзён.

3. У выпадку паўторнага адхілення прапанаванай Прэзідэнтам кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра або ў выпадку, калі Прэзідэнт не прадставіць Сойму кандыдатуру Прэм'ер-міністра ў тэрмін, указаны ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, права вылучэння кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра пераходзіць да Сойма.

4. Рашэнне аб прызначэнні на пасаду Прэм'ер-міністра прымаецца Соймам большасцю галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма.

5. Калі за двухтыднёвы тэрмін з дня пераходу права на вылучэнне кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра да Сойма ён не прызначыць на пасаду Прэм'ер-міністра, Прэзідэнт павінен або прызначыць Прэм'ер-міністра з ліку кандыдатаў, якія набралі найбольшую колькасць галасоў дэпутатаў, або прыняць рашэнне аб правядзенні датэрміновых выбараў Сойма. Рашэнне па гэтым пытанні Прэзідэнт прымае пасля афіцыйнай кансультацыі з Прэзідыумам Сойму не пазней за месячны тэрмін пасля пераходу права на вылучэнне кандыдатуры на пасаду Прэм'ер-міністра да Сойма.

## Артыкул 103. Адстаўка, выказванне даверу або недаверу Ураду

1. Урад складае свае паўнамоцтвы перад нававыбраным Соймам на яго першым пасяджэнні і прадаўжае выконваць абавязкі да прызначэння новага Прэм'ер-міністра.

2. Урад або любы член Урада маюць права заявіць аб сваёй адстаўцы, калі лічаць немагчымым выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў. У выпадку адстаўкі Прэм'ер-міністра ідзе ў адстаўку ўвесь Урад.

3. Прэм'ер-міністр можа паставіць перад Соймам пытанне аб даверы Ураду. Пытанне аб даверы можа быць пастаўлена на галасаванне не раней заканчэння сямі дзён і не пазней за чатырнаццаць дзён з дня яго ўнясення і прымаецца Соймам большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу. Калі Сойм адмаўляе ў даверы Ураду, Урад складае свае паўнамоцтвы і прадаўжае выконваць абавязкі да прызначэння новага Прэм'ер-міністра. У гэтым выпадку Сойм у двухтыднёвы тэрмін павінен большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу прызначыць на пасаду новага Прэм'ер-міністра, інакш уступае ў сілу дзеянне пункта 5 артыкула 102 Канстытуцыі.

4. Дэпутаты Сойма ў колькасці не менш за адну чацвёртую ад канстытуцыйнага складу маюць права паставіць перад Соймам пытанне аб недаверы Ураду. Разам з узбуджэннем пытання аб недаверы ініцыятары вылучаюць кандыдата на пасаду Прэм'ер-міністра, а кандыдат на пасаду Прэм'ер-міністра прадстаўляе Сойму новы склад Урада і праграму Урада. Калі Сойм не раней за сем і не пазней за чатырнаццаць дзён пасля ўзбуджэння пытання аб недаверы Ураду большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу прызначыць на пасаду новага Прэм'ер-міністра, недавер Ураду лічыцца выяўленым.

5. Паўнамоцтвы Урада спыняюцца з моманту прызначэння на пасаду новага Прэм'ер-міністра.

6. Паўторная прапанова пытання аб даверы або недаверы Ураду можа быць унесена ў Сойм не раней як па заканчэнні шасці месяцаў з дня ўнясення папярэдняй прапановы.

7. Галасаванне па пытанню аб даверы або недаверы Ураду не можа праводзіцца ў першыя тры месяцы пасля прызначэння Прэм'ер-міністра і ў апошнія шэсць месяцаў тэрміну паўнамоцтваў Сойма.

8. У выпадку добраахвотнай адстаўкі, смерці або працяглай непрацаздольнасці Прэм'ер-міністра, Прэзідэнт прызначае часова выконваючага абавязкі Прэм'ер-міністра і Урад прадаўжае часова выконваць свае паўнамоцтвы да прызначэння новага Прэм'ер-міністра ў адпаведнасці з артыкулам 102 Канстытуцыі.

## *Артыкул 104. Паўнамоцтвы Урада*

1. Урад:

1.1. забяспечвае выкананне законаў, міжнародных і міжурадавых дагавораў;

1.2. распрацоўвае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі, прымае меры па іх рэалізацыі;

1.3. распрацоўвае і прадстаўляе Сойму праект дзяржаўнага бюджэту, арганізуе выкананне дзяржаўнага бюджэту;

1.4. арганізуе кіраванне міністэрствамі і іншымі арганізацыямі, падсправаздачнымі Ураду;

1.5. ажыццяўляе нагляд за законнасцю дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў межах і формах, вызначаных Канстытуцыяй і законамі;

1.6. у выпадку стыхійнага бедства, эпідэміі, прыроднай або тэхнагеннай катастрофы, а таксама беспарадкаў, якія суправаджаюцца насіллем з боку групы асоб і арганізацый, пры якой дзяржаўныя органы не маюць магчымасці для нармальнага выканання сваіх абавязкаў, уводзіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або ў асобных яе мясцовасцях надзвычайнае становішча на тэрмін не больш за 90 дзён з унясеннем у двухдзённы тэрмін прынятага рашэння на разгляд Сойма;

1.7. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, ускладзеныя на яго Канстытуцыяй і законамі.

2. Урад штогод прадстаўляе Сойму справаздачу аб дзейнасці Урада, аб выкананні дзяржаўнага бюджэту, іншыя справаздачы, устаноўленыя Канстытуцыяй і законам.

## *Артыкул 105. Паўнамоцтвы членаў Урада*

1. Паўнамоцтвы Прэм'ер-міністра:

1.1. прызначае на пасаду і вызваляе ад пасады сваіх намеснікаў і міністраў;

1.2. арганізуе работу Урада і старшынствуе на яго пасяджэннях;

1.3. прадстаўляе Урад;

1.4. падпісвае пастановы Урада, міжурадавыя дагаворы, выдае ў межах сваёй кампетэнцыі распараджэнні;

1.5. выконвае іншыя функцыі, звязаныя з арганізацыяй і дзейнасцю Урада.

2. Прэм'ер-міністр падсправаздачны Сойму. Раз у год ён прадстаўляе Сойму даклад аб ходзе выканання праграмы Урада, а таксама па патрабаванні Сойма - справаздачу аб ходзе выканання асобных частак праграмы Урада.

3. Паўнамоцтвы міністра:

3.1. кіруе міністэрствам;

3.2. забяспечвае ўзаемадзеянне паміж Урадам і іншымі дзяржаўнымі органамі па пытаннях, якія датычацца дзейнасці адпаведнага міністэрства;

3.3. выконвае іншыя функцыі, прадугледжаныя законамі.

4. Намеснікі Прэм'ер-міністра і міністры падсправаздачныя і нясуць адказнасць перад Прэм'ер-міністрам, а таксама ў рамках салідарнай адказнасці Урада - перад Соймам.

5. Члены Урада могуць удзельнічаць у пасяджэннях Сойма і яго камісій. Калі заяўлена патрабаванне іх прысутнасці, то іх удзел з'яўляецца абавязковым.

6. Паўнамоцтвы члена Урада спыняюцца ў выпадку адстаўкі, вызвалення ад пасады, несумяшчальнасці пасад па рашэнню суда, смерці або працяглай фізічнай непрацаздольнасці.

## *Артыкул 106. Пастановы Урада*

1. Урад у межах сваіх паўнамоцтваў на падставе Канстытуцыі і законаў выдае пастановы, якія з'яўляюцца нарматыўнымі прававымі актамі і маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Пастанова Урада лічыцца прынятай, калі за яе прагаласавала большасць ад агульнай колькасці членаў Урада.

3. Пастанова Урада падпісваецца Прэм'ер-міністрам і кантрасігнуюцца міністрамі, якія абавязаны прывесці яе ў выкананне. Пастанова Урада ўступае ў сілу з дня яе афіцыйнага апублікавання, калі іншае не прадугледжана самой пастановай, але не раней за дзень яе апублікавання.

## *Артыкул 107. Нагляд за дзейнасцю мясцовых самакіраванняў*

1. Міністэрствы ў межах сваіх паўнамоцтваў і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі Урада ў адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках ажыццяўляюць нагляд за аднастайным выкананнем нарматыўных прававых актаў органамі мясцовага самакіравання.

2. Міністэрствы і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі Урада не маюць права ўмешвацца ў кампетэнцыю органаў мясцовага самакіравання і ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў адпаведнасці з законам.

3. У выпадку прыняцця органам мясцовага самакіравання рашэння, якое супярэчыць заканадаўству, міністэрствы і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі Урада ва ўстаноўленым парадку прапануюць органу мясцовага самакіравання адмяніць гэтае рашэнне, або звяртаюцца ў суд.

# ГЛАВА 8. МЯСЦОВЫ САМАКІРАВАННЕ

## *Артыкул 108. Грамада*

1. Супольнасць грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі адзінкі мясцовага самакіравання, - грамада - валодае правам самастойна і пад сваю адказнасць вырашаць пытанні мясцовага значэння.

2. Мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца грамадой праз органы мясцовага самакіравання, а таксама непасрэдна ў выпадках, прадугледжаных законам.

3. Грамада садзейнічае развіццю разнастайных прамых формаў удзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні.

## *Артыкул 109. Сістэма адзінак мясцовага самакіравання*

1. Колькасць тэрытарыяльных узроўняў адзінак мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь і адпаведнасць узроўняў мясцовага самакіравання адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам устанаўліваецца арганічным законам.

2. Рашэнне аб стварэнні, скасаванні адзінкі мясцовага самакіравання або змяненні яе межаў па прадстаўленні Урада прымае Сойм пасля кансультацый з адпаведнымі адзінкамі мясцовага самакіравання.

3. Кожная адзінка мясцовага самакіравання мае свой статут.

4. Мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым арганічным законам.

## *Артыкул 110. Размежаванне паўнамоцтваў*

1. Размежаванне паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады і органамі мясцовага самакіравання, а таксама паміж органамі мясцовага самакіравання рознага тэрытарыяльнага ўзроўню рэгулюецца арганічным законам на аснове прынцыпаў субсідыярнасці і суразмернасці рэсурсаў аб'ёму паўнамоцтваў.

2. Адзінкі мясцовага самакіравання правамоцныя па ўласнай ініцыятыве прымаць рашэнні па ўсіх пытаннях, якія не аднесены законам да паўнамоцтваў дзяржаўнай улады і органаў мясцовага самакіравання больш высокага тэрытарыяльнага ўзроўню.

3. Дэлегаванне дзяржаўнай уладай паўнамоцтваў адзінцы мясцовага самакіравання ажыццяўляецца на падставе закону або дагавора.

## *Артыкул 111. Фарміраванне органаў мясцовага самакіравання*

1. Прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання і кіраўнікі выканаўчых органаў мясцовага самакіравання ў выпадках, калі іх абранне прадугледжана шляхам прамых выбараў грамадзян, абіраюцца грамадзянамі, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі. Тэрмін паўнамоцтваў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання - чатыры гады.

2. Чарговыя выбары прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання праводзяцца ў другую нядзелю красавіка апошняга поўнага каляндарнага года паўнамоцтваў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання.

3. Пачаткам тэрміна паўнамоцтваў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання з'яўляецца першае пасяджэнне ізноў абранага складу прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання. З пачаткам гэтага пасяджэння заканчваецца тэрмін паўнамоцтваў раней абраных дэпутатаў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання.

4. Выканаўчыя органы мясцовага самакіравання фарміруюцца адзінкамі мясцовага самакіравання самастойна ў адпаведнасці з арганічным законам, выконваюць рашэнні прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання і падсправаздачныя ім.

## *Артыкул 112. Выключныя кампетэнцыі прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання*

1. Да выключнай кампетэнцыі прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання адносяцца:

1.1. зацвярджэнне структуры выканаўчага органа мясцовага самакіравання;

1.2. прызначэнне кіраўніка выканаўчага органа мясцовага самакіравання ў выпадках, калі яго абранне не прадугледжана шляхам прамых выбараў грамадзян;

1.3. зацвярджэнне праграм развіцця адзінкі мясцовага самакіравання;

1.4. зацвярджэнне бюджэту адзінкі мясцовага самакіравання і справаздачы аб яго выкананні;

1.5. вызначэнне парадку кіравання і распараджэння ўласнасцю адзінкі мясцовага самакіравання;

1.6. прыняцце статута і ўстанова сімвалаў адзінкі мясцовага самакіравання;

1.7. устанаўленне ў адпаведнасці з законам мясцовых падаткаў і збораў;

1.8. абранне аўдытара, які ажыццяўляе кантроль за выкарыстаннем маёмасці і выкананнем бюджэту адзінкі мясцовага самакіравання;

1.9. прызначэнне мясцовых рэферэндумаў.

2. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання можа адмяняць рашэнні выканаўчага органа мясцовага самакіравання.

3. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання вырашае іншыя пытанні мясцовага значэння, якія аднесены законам да яго кампетэнцыі.

## *Артыкул 113. Мясцовыя бюджэты*

1. Даходы адзінак мясцовага самакіравання фарміруюцца за кошт дзяржаўных і мясцовых падаткаў, неналогавых паступленняў у парадку, устаноўленым законам.

2. Дзяржава сумесна з органамі мясцовага самакіравання карэктуе фінансавае становішча адзінак мясцовага самакіравання пасродкам налагаабкладання і вылучэння датацый, субсідый і субвенцый.

3. Расходы адзінак мясцовага самакіравання, звязаных з выкананнем дэлегаваных паўнамоцтваў дзяржаўнай улады, а таксама якія ўзніклі ў выніку дзеянняў і рашэнняў органаў дзяржаўнай улады, фінансуюцца ў поўным аб'ёме за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

## *Артыкул 114. Абавязковасць рашэнняў*

Рашэнні прадстаўнічых і выканаўчых органаў мясцовага самакіравання, прынятыя ў межах іх паўнамоцтваў, маюць абавязковую сілу на адпаведнай тэрыторыі.

## *Артыкул 115. Права на аб'яднанне і супрацоўніцтва*

Адзінкі мясцовага самакіравання маюць права супрацоўнічаць і ўступаць у аб'яднанні з іншымі адзінкамі мясцовага самакіравання для ажыццяўлення задач, якія ўяўляюць агульную цікавасць.

## *Артыкул 116. Нагляд за выкананнем заканадаўства*

Нагляд за выкананнем органамі мясцовага самакіравання нарматыўных прававых актаў, а таксама кантроль за рэалізацыяй дэлегаваных дзяржаўнай уладай паўнамоцтваў ажыццяўляецца дзяржаўнымі органамі ў парадку, устаноўленым законам.

## *Артыкул 117. Судовая абарона правоў мясцовага самакіравання*

Адзінкі мясцовага самакіравання і створаныя імі органы маюць права на судовую абарону.

## *Артыкул 118. Датэрміновыя выбары*

1. Сойм па прапанове Урада можа прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання ў выпадку парушэння ім Канстытуцыі і па іншых падставах, прадугледжаных законам. Рашэнне Сойма аб

датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання ўступае ў сілу пасля праверкі яго канстытуцыйнасці ў Канстытуцыйным судзе.

2. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад колькасці выбраных дэпутатаў можа прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання. Разам з датэрміновымі выбарамі прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання праводзяцца і датэрміновыя выбары кіраўніка выканаўчага органа мясцовага самакіравання ў выпадках выбрання яго грамадзянамі.

3. Дата датэрміновых выбараў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання прызначаецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй на працягу дзесяці дзён з моманту прыняцця рашэння аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання і выбары павінны быць праведзены на працягу трох месяцаў пасля прыняцця рашэння аб датэрміновых выбарах.

## ГЛАВА 9. СУДОВАЯ УЛАДА

### *Артыкул 119. Судовая сістэма*

1. Правасуддзе ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца выключна судамі.

2. Суды ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца незалежнымі.

3. Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі.

4. Утварэнне надзвычайных судоў забараняецца.

5. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшай судовай інстанцыяй, якая ажыццяўляе правасуддзе па справах, якія не аднесены да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда, ажыццяўляе перагляд пастаноў ніжэйстаячых судоў, рэалізуе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з законам.

6. Судаўпарадкаванне, кампетэнцыі і парадак разгляду спраў у судах, удзел грамадзян у адпраўленні правасуддзя вызначаюцца арганічным законам.

7. Беларусь можа прыняць рашэнне аб прызнанні юрысдыкцыі міжнароднага суда. Рашэнні міжнародных судоў, чыя юрысдыкцыя прызнана Рэспублікай Беларусь, абавязковыя для выканання дзяржаўнымі органамі.

### *Артыкул 120. Суддзі*

1. Суддзямі могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія маюць высокія маральныя якасці, адпаведную адукацыю ў галіне права, якія прайшлі абавязковую падрыхтоўку і паспяхова здалі кваліфікацыйны экзамен для займання пасады суддзі.

2. Суддзі не могуць быць членамі палітычных партый, а таксама не могуць быць дэпутатамі Сойму і прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання, выконваць работу ў органах заканадаўчай і выканаўчай улады. Законам можа быць устаноўлена несумяшчальнасць пасады суддзі пры выкананні службовых абавязкаў з іншымі пасадамі або родам дзейнасці.

## Артыкул 121. Прызначэнне суддзі на пасаду

1. Суддзі, акрамя суддзяў Канстытуцыйнага Суда, прызначаюцца на пасады Нацыянальнай радай правасуддзя бестэрмінова, у парадку, устаноўленым арганічным законам.

2. Законам устанаўліваюцца аб'ектыўныя крытэрыі, якія гарантуюць адбор і прасоўванне суддзяў па службе на падставе іх заслуг з улікам кваліфікацыі, добрасумленнасці, здольнасцей і эфектыўнасці.

3. Старшыня і намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда выбіраюцца на пасаду суддзямі Вярхоўнага Суда ў парадку, устаноўленым законам.

## Артыкул 122. Незалежнасць і недатыкальнасць суддзяў

1. Суддзі пры адпраўленні правасуддзя незалежныя. Прамы або ўскосны ўплыў на суддзю пры адпраўленні правасуддзя недапушчальны і цягне за сабой устаноўленую законам адказнасць.

2. Суддзі маюць недатыкальнасць. Суддзя не можа быць затрыманы або арыштаваны па падазрэнні ва ўчыненні злачынства без згоды Нацыянальнага савета правасуддзя, за выключэннем выпадку, калі ён заспеты на месцы ўчынення цяжкага злачынства. Для затрымання або арышту суддзі Канстытуцыйнага Суда, акрамя пазначаных вышэй выключэнняў, патрабуецца згода Канстытуцыйнага Суда.

3. Суддзя не можа быць прыцягнуты да адказнасці за прынятае ім судовае рашэнне, за выключэннем здзяйснення злачынства або дысцыплінарнай правіннасці.

4. Паўнамоцтвы суддзі могуць быць спынены ў выпадку:

4.1. адстаўкі або падачы заявы аб вызваленні ад пасады па ўласным жаданні;

4.2. прызначэння (абрання) на іншую пасаду або пераводу на іншую работу з іх згоды;

4.3. заканчэння тэрміну паўнамоцтваў або дасягнення ўстаноўленага законам узросту;

4.4. спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

4.5. нязгоды на перавод у іншы суд у выпадку ліквідацыі або рэарганізацыі суда, у якім суддзя займае пасаду;

4.6. прызнання суддзі не здольным па стане здароўя выконваць абавязкі суддзі, уступлення ў законную сілу рашэння суда аб прызнанні суддзі абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным;

4.7. заняткі дзейнасцю, несумяшчальнай з пасадай суддзі, здзяйснення дысцыплінарнай правіннасці, несумяшчальнай са статусам суддзі, па падставах, прадугледжаных арганічным законам;

4.8. уступлення ў законную сілу абвінаваўчага прыгавору ў дачыненні да суддзі за ўчыненне ім злачынства;

4.9. смерці суддзі, аб'яўлення яго памерлым або прызнання адсутным без вестак рашэннем суда, які ўступіў у законную сілу;

4.10. парушэнне суддзёй абавязку пацвердзіць законнасць крыніцы паходжання маёмасці, якая падлягае дэкляраванню.

5. Рашэнне аб спыненні паўнамоцтваў суддзі прымаецца Нацыянальнай радай правасуддзя і дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў судовым парадку. Рашэнне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў суддзі Канстытуцыйнага суда можа быць абскарджана толькі ў Канстытуцыйным судзе.

6. Суддзя, члены яго сям'і і іх маёмасць знаходзяцца пад абаронай дзяржавы, калі бяспека суддзі знаходзіцца пад пагрозай у сувязі з выкананнем прафесійных абавязкаў.

7. Гарантыі незалежнасці і прававы статус суддзяў устанаўліваюцца арганічным законам.

### *Артыкул 123. Судаводства*

1. У судах справы разглядаюцца ў адкрытых паседжаннях. Разгляд спраў у закрытых пасяджэннях дапускаецца толькі ў прадугледжаных законам выпадках.

2. Судаводства ажыццяўляецца на аснове раўнапраўя і спаборнасці бакоў.

3. Непрадузятасць суддзі можа быць пастаўлена пад сумненне бакамі або самім суддзёй пры выкананні сваіх абавязкаў у адпаведнасці з законам.

4. Закон можа прадугледжваць удзел прысяжных засядацеляў у судовым працэсе.

5. Судовыя пастановы павінны быць заснаваны на канкрэтна і падрабязна выкладзеных аргументах, абвяшчаюцца і публікуюцца. Па справах, разгледжаных у закрытым судовым пасяджэнні, публічна абвяшчаецца і публікуецца толькі рэзалютыўная частка судовай пастановы.

6. Судовыя пастановы засноўваюцца на меркаванні большасці суддзяў, якія разглядаюць справу.

7. Судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, абавязковыя для выканання.

8. Бакі і асобы, якія ўдзельнічаюць у судовым працэсе, маюць права на абскарджанне судовых пастаноў у парадку, вызначаным законам.

## *Артыкул 124. Пытанні канстытуцыйнасці*

1. Суды адпраўляюць правасуддзе на падставе Канстытуцыі, законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, прынятых у адпаведнасці з імі, а таксама ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь міжнароднымі дамовамі.

2. Судам забараняецца прымяняць нормы, якія супярэчаць нарматыўным прававым актам, якія маюць больш высокую юрыдычную сілу.

3. Нарматыўны прававы акт (або яго частка), прызнаны судом не адпаведным нарматыўнаму прававому акту, які мае больш высокую юрыдычную сілу за выключэннем Канстытуцыі, страчвае юрыдычную сілу з дня, указанага ў рашэнні суда.

4. Калі ў суда ёсць сумненні або ўзнікае нявызначанасць па пытанні аб адпаведнасці Канстытуцыі прымененага або падлягаючага прымяненню нарматыўнага прававога акта, то ён прымае рашэнне аб прыпыненні вытворчасці па справе і накіроўвае ў Канстытуцыйны Суд запыт аб адпаведнасці гэтага нарматыўнага прававога акта Канстытуцыі.

## *Артыкул 125. Нацыянальная рада правасуддзя*

1. Нацыянальная рада правасуддзя адказвае за фармаванне высокапрафесійнага судзейскага корпуса і забеспячэнне незалежнасці судоў і асобных суддзяў.

2. Палова членаў Нацыянальнай рады правасуддзя абіраецца з'ездам суддзяў Рэспублікі Беларусь, як дзейных, так і якія знаходзяцца ў адстаўцы. Іншая палова сябраў Нацыянальнай рады правасуддзя абіраецца з'ездам прадстаўнікоў юрыдычных вышэйшых навучальных устаноў, навуковых устаноў, аб'яднанняў адвакатаў, грамадскіх арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у галіне права. Крытэрыі адпаведнасці і парадак абрання чальцоў Нацыянальнай рады правасуддзя вызначаецца арганічным законам.

3. Тэрмін паўнамоцтваў абраных чальцоў Нацыянальнай рады правасуддзя складае пяць гадоў і яны працягваюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміна сваіх паўнамоцтваў да моманту абрання новага складу. Пералік падстаў для датэрміновага спынення паўнамоцтваў члена Нацыянальнай рады правасуддзя аналагічны нормам, прадугледжаных для датэрміновага вызвалення суддзяў.

4. Чальцы Нацыянальнай рады правасуддзя выконваюць свае абавязкі на сталай аснове. Па заканчэнні паўнамоцтваў член Нацыянальнай рады правасуддзя мае права вярнуцца на пасаду, якую займаў да абрання ў Нацыянальную раду правасуддзя, або на раўнацэнную пасаду.

5 Асноўнымі задачамі Нацыянальнай рады правасуддзя з'яўляюцца:

5.1. фарміраванне судзейскага корпуса і прызначэнне суддзяў на пасады;

5.2. прыняцце мер па прадухіленні парушэння незалежнасці і недатыкальнасці суддзяў, умяшання ў іх дзейнасць па адпраўленні правасуддзя;

5.3. арганізацыя прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі суддзяў;

5.4. ацэнка дзейнасці суддзяў;

5.5. арганізацыя і вядзенне дысцыплінарнай вытворчасці;

5.6. падтрыманне высокіх норм судзейскай этыкі;

5.7. падрыхтоўка прапаноў па далейшым удасканаленні заканадаўства ў судова-прававой сферы;

5.8. іншыя задачы, вызначаныя законам.

6. Арганізацыя і парадак дзейнасці Нацыянальнай рады правасуддзя вызначаюцца арганічным законам.

### *Артыкул 126. Фінансавае і арганізацыйнае забеспячэнне судоў*

1. Фінансаванне судоў ажыццяўляецца за кошт дзяржаўнага бюджэту.

2. Нацыянальны савет правасуддзя прадстаўляе Ураду інфармацыю аб бюджэтных патрабаваннях судовай сістэмы ў працэсе падрыхтоўкі праекта дзяржаўнага бюджэту, а таксама мае права выступаць перад Соймам у ходзе абмеркавання праекта дзяржаўнага бюджэту перад яго зацвярджэннем.

---

## ГЛАВА 10. КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД

### *Артыкул 127. Суддзі Канстытуцыйнага Суда*

1. Канстытуцыйны Суд складаецца з 15 суддзяў, якія прызначаюцца тэрмінам на 9 гадоў. Па пяць суддзяў Канстытуцыйнага Суда прызначаюцца Соймам з ліку кандыдатаў, якія прадстаўляюцца Прэзідэнтам, Старшынёй Сойма і Старшынёй Вярхоўнага Суда. Колькасць прадстаўленых кандыдатаў павінна быць не менш за два на кожную вакансію суддзі Канстытуцыйнага Суда. Рашэнне аб прызначэнні суддзі Канстытуцыйнага Суда прымаецца Соймам большасцю галасоў ад канстытуцыйнага складу Сойма тайным галасаваннем.

2. Суддзёй Канстытуцыйнага Суда можа быць прызначаны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае бездакорную рэпутацыю, вышэйшую юрыдычную адукацыю, які валодае агульнапрызнанымі дасягненнямі ў сферы права і прапрацаваў па юрыдычнай спецыяльнасці не менш як 15 гадоў. Паўторнае прызначэнне на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда не дапускаецца.

3. Суддзі Канстытуцыйнага Суда абіраюць тайным галасаваннем Старшыні і намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда тэрмінам на тры гады.

4. Склад Канстытуцыйнага Суда кожныя тры гады абнаўляецца на адну трэць. Суддзя Канстытуцыйнага Суда працягвае працаваць у Канстытуцыйным Судзе пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту прызначэння свайго пераемніка. Пасля заканчэння паўнамоцтваў суддзя мае права вярнуцца на пасаду, якую займаў да прызначэння ў Канстытуцыйны Суд, або на раўнацэнную пасаду.

5. Пры выкананні сваіх абавязкаў суддзі Канстытуцыйнага Суда незалежныя і кіруюцца толькі Канстытуцыяй.

6. Суддзі Канстытуцыйнага Суда ўступаюць на пасаду пасля прынясення прысягі ў Сойме.

7. Паўнамоцтвы суддзі Канстытуцыйнага Суда могуць быць датэрмінова спынены ў выпадках і парадку, вызначаных у артыкуле 122 Канстытуцыі, за выключэннем падпункта 4.5 пункта 4.

### *Артыкул 128. Паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда*

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні:

1.1. па пытаннях адпаведнасці нарматыўных прававых актаў Сойма, Прэзідэнта, Урада Канстытуцыі на падставе звароту Прэзідэнта, Урада, не менш як адной пятай ад канстытуцыйнага складу Сойма;

1.2. аб адпаведнасці міжнародных дагавораў, пададзеных на ратыфікацыю, Канстытуцыі на падставе звароту Прэзідэнта, Урада, не менш як адной пятай ад канстытуцыйнага складу Сойма;

1.3. аб канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, якія падлягаюць прымяненню судом пры разглядзе канкрэтных спраў і якія па яго абгрунтаваным меркаванні могуць супярэчыць Канстытуцыі на падставе звароту суда;

1.4. аб канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў прымяняльна да асноўных правоў і свабод чалавека на падставе звароту Упаўнаважанага па правах чалавека;

1.5. аб ушчамленні канстытуцыйных правоў і свабод на падставе канстытуцыйнай скаргі кожнай асобы, пададзенай у парадку, вызначаным законам, пры вычарпанні ўсіх іншых прававых механізмаў;

1.6. аб зняцці Прэзідэнта з пасады пры парушэнні Прэзідэнтам Прысягі або ўчыненні ім злачынства на падставе звароту Сойма ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 92 Канстытуцыі;

1.7. аб канстытуцыйнасці рашэння аб прызначэнні датэрміновых выбараў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання на падставе звароту Сойма ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 118 Канстытуцыі;

1.8. ажыццяўляе іншыя, вызначаныя Канстытуцыяй паўнамоцтвы.

2. На падставе звароту Сойму, Прэзідэнта, Урада, Нацыянальнай рады правасуддзя, Праўлення Нацыянальнага банка, Цэнтральнай выбарчай камісіі, Упаўнаважанага па правам чалавека, Кантрольнай палаты, Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі, Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі, органа мясцовага самакіравання Канстытуцыйны Суд разглядае спрэчкі, якія датычацца паўнамоцтваў адпаведных органаў;

3.Канстытуцыйны Суд для абароны грамадскіх інтарэсаў мае права прадоўжыць разгляд звароту нават у выпадку яго адклікання.

4. Канстытуцыйны Суд пры разглядзе пытання аб неканстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта мае права спыніць яго дзеянне, калі дзеянне адпаведнага акта ў далейшым можа нанесці ўрон або стаць прычынай парушэнняў, якія не могуць быць кампенсаваны або адноўлены.

### *Артыкул 129. Пасяджэнні і рашэнні Канстытуцыйнага Суда*

1. Арганізацыя Канстытуцыйнага Суда і парадак судаводства ў ім рэгулюецца арганічным законам. Змяненні і дапаўненні ў гэты закон уступаюць у сілу пасля заключэння Канстытуцыйнага суда аб іх адпаведнасці Канстытуцыі.

2. Пытанні, якія аднесены да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда, разглядаюцца ў адкрытых засядджэннях.

3. Рашэнні Канстытуцыйнага Суда абвяшчаюцца публічна, з'яўляюцца канчатковымі, абавязковымі для выканання і абскарджанню не падлягаюць.

4. Нарматыўны прававы акт (або яго частка), прызнаны Канстытуцыйным Судом не адпаведным Канстытуцыі, страчвае юрыдычную сілу з дня, указанага ў рашэнні Канстытуцыйнага Суда.

5. Невыкананне, неналежнае выкананне або перашкода выкананню рашэнняў Канстытуцыйнага Суда цягне адказнасць па законе.

6. Усе матэрыялы па скончаных справах Канстытуцыйнага суда, за выключэннем тых, што ўтрымліваюць дзяржаўную тайну або персанальныя даныя, знаходзяцца ў адкрытым доступе.

---

## ГЛАВА 11. ПРАКУРАТУРА

### *Артыкул 130. Паўнамоцтвы Пракуратуры*

1. Пракуратура Рэспублікі Беларусь прымае меры да прыцягнення вінаватых у здзяйсненні злачынстваў да крымінальнай адказнасці, падтрымлівае абвінавачванне ў судах па крымінальных справах, ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў у дзейнасці органаў дазнання і папярэдняга следства, у месцах папярэдняга зняволення і месцах пазбаўлення волі, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, вызначаныя законам.

2. Арганізацыя і парадак дзейнасці Пракуратуры вызначаюцца арганічным законам.

### Артыкул 131. Прызначэнні і тэрмін паўнамоцтваў пракурораў

1. Генеральны пракурор прызначаецца Соймам тэрмінам на пяць гадоў і працягвае займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту прызначэння свайго пераемніка. Кандыдатуру на пасаду Генеральнага пракурора прадстаўляе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Адна і тая ж асоба не можа займаць пасаду Генеральнага пракурора два тэрміны запар.

2. Падначаленыя пракуроры прызначаюцца Генеральным пракурорам і падпарадкоўваюцца яму.

3. У выпадках і парадку, устаноўленым законам, Соймам можа прызначацца спецыяльны пракурор, падсправаздачны непасрэдна Сойму.

4. Пасада пракурора несумяшчальная з якой-небудзь іншай пасадай, якая аплачваецца, за выключэннем выкладчыцкай і навуковай дзейнасці.

5. Парадак прызначэння і вызвалення пракурораў, іх статус і гарантыі незалежнасці ўстанаўліваюцца арганічным законам.

## ГЛАВА 12. АДВАКАТУРА

### Артыкул 132. Інстытут адвакатуры

1. Адвакатура з'яўляецца супольнасцю адвакатаў, якія аказваюць на прафесійнай аснове юрыдычную дапамогу любым асобам у мэтах рэалізацыі і абароны іх правоў, свабод і законных інтарэсаў, а таксама забеспячэння доступу да правасуддзя.

2. Арганізацыя і кіраванне дзейнасцю адвакатуры ажыццяўляецца недзяржаўнымі незалежнымі самакіравальнымі аб'яднаннямі адвакатаў, якія прадстаўляюць і абараняюць іх інтарэсы, якія спрыяюць іх прафесійнай падрыхтоўцы, падтрыманню прафесійных этычных і прававых стандартаў. Сяброўства адваката ў адным з аб'яднанняў адвакатаў абавязковае.

3. Фінансаванне дзейнасці адвакатаў, якія аказваюць юрыдычную дапамогу бясплатна ў выпадках, прадугледжаных законам, здзяйсняецца з дзяржаўнага бюджэту.

### Артыкул 133. Статус адваката

1. Рашэнне аб прысваенні або пазбаўленні статусу адваката і права ажыццяўляць адвакацкую дзейнасць прымаецца незалежным органам адвакатуры ва ўстаноўленым законам парадку на аснове аб'ектыўнасці і галоснасці, з правам абскарджання прынятага рашэння ў судзе.

2. Законам устанаўліваюцца патрабаванні да прэтэндэнта на прысваенне статусу адваката, пералік асоб, якія не могуць быць адвакатамі, а таксама віды дзейнасці, несумяшчальныя з адвакацкай.

3. Адвакат мае права ажыццяўляць адвакацкую дзейнасць на ўсёй тэрыторыі Беларусі без якога-небудзь дадатковага дазволу або апавяшчэння як індывідуальна, так і ва ўсталяваных законам арганізацыйных формах адвакацкай дзейнасці.

### Артыкул 134. Гарантыі адвакацкай дзейнасці

1. Умяшанне ў адвакацкую дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, або перашкоды гэтай дзейнасці якім бы там ні было чынам забараняюцца.

2. Адвакат мае права на асабістую сустрэчу са сваім кліентам ва ўмовах, якія гарантуюць канфідэнцыяльнасць. Абмежаванне колькасці і працягласці такіх сустрэч забараняецца.

3. Адвакатам гарантуецца прадастаўленне поўнага доступу да інфармацыі, матэрыялаў і дакументаў, неабходных для падрыхтоўкі і належнага аказання юрыдычнай дапамогі.

4. Адвакацкая таямніца ахоўваецца законам бестэрмінова.

---

## ГЛАВА 13. УПАЎНАВАЖАНЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

### Артыкул 135. Роля і статус

Упаўнаважаны па правах чалавека з'яўляецца службовай асобай, якая дзейнічае ў мэтах заахвочвання і абароны правоў і свабод чалавека.

### Артыкул 136. Абранне на пасаду і тэрмін паўнамоцтваў

1. Упаўнаважаным па правах чалавека можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае вопыт праваабарончай дзейнасці і валодае высокімі маральнымі якасцямі.

2. Упаўнаважаны па правах чалавека абіраецца Соймам тэрмінам на сем гадоў па выніках адкрытага конкурсу без права перавыбрання і працягвае займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту абрання свайго пераемніка.

3. На перыяд сваіх паўнамоцтваў Упаўнаважаны па правах чалавека не павінен удзельнічаць у палітычнай дзейнасці.

4. Падставы для спынення паўнамоцтваў і вызвалення ад пасады Упаўнаважанага па правах чалавека ўстанаўліваецца законам.

## *Артыкул 137. Незалежнасць і недатыкальнасць*

1. Упаўнаважаны па правах чалавека пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў незалежны ад якіх-небудзь дзяржаўных органаў і службовых асоб.

2. Умяшанне ў дзейнасць Упаўнаважанага па правах чалавека з мэтай паўплываць на яго рашэнне, а таксама перашкоды дзейнасці Упаўнаважанага па правах чалавека ў іншай форме прыводзяць да адказнасці па законе.

3. Упаўнаважаны па правах чалавека, яго намеснікі і супрацоўнікі яго офіса, якія маюць права прыняцця рашэнняў, карыстаюцца імунітэтам ад судовага пераследу ў дачыненні да заяў, зробленых вусна ці пісьмова ў афіцыйнай якасці. Упаўнаважаны па правах чалавека не можа быць арыштаваны, ці іншым чынам пазбаўлены асабістай свабоды без згоды Сойма, акрамя выпадкаў затрымання на месцы ўчынення ім цяжкага злачынства. Крымінальная справа супраць Упаўнаважанага па правах чалавека можа быць узбуджана выключна Генеральным пракурорам.

## *Артыкул 138. Правы і паўнамоцтвы*

1. Упаўнаважаны па правах чалавека:

1.1. у адпаведнасці з законам разглядае скаргі любых асоб, а таксама па сваёй ініцыятыве правярае факты парушэнняў правоў і свабод чалавека;

1.2. садзейнічае ўдасканаленню заканадаўства і практык у галіне правоў і свабод чалавека;

1.3. ажыццяўляе маніторынг выканання правоў і свабод чалавека;

1.4. удзельнічае ў падрыхтоўцы дакладаў, звязаных з прасоўваннем і абаронай правоў чалавека, якія дзяржава павінна прадастаўляць міжнародным арганізацыям у выкананне сваіх абавязкаў;

1.5. супрацоўнічае з нацыянальнымі і міжнароднымі арганізацыямі, кампетэнтнымі ў пытаннях заахвочвання і абароны правоў чалавека.

2.Упаўнаважаны па правах чалавека мае права асабіста альбо праз свайго прадстаўніка:

2.1. запытваць і атрымліваць ад дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, службовых асоб звесткі, дакументы і матэрыялы, неабходныя для рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў;

2.2. атрымліваць тлумачэнні ад службовых асоб у ходзе разгляду скаргі;

2.3. бесперашкодна без папярэдняга ўзгаднення наведваць самастойна або сумесна з прадстаўнікамі кампетэнтных дзяржаўных органаў дзяржаўныя органы, воінскія часці, месцы папярэдняга зняволення і адбывання крымінальных пакаранняў і іншыя арганізацыі;

2.4. накіроўваць рэкамендацыі любым органам або арганізацыям у рамках сваёй кампетэнцыі і атрымліваць адказы на свае рэкамендацыі ва ўстаноўлены тэрмін;

2.5. звяртацца ў суд і іншыя дзяржаўныя органы з заявай у абарону правоў і свабод, парушаных рашэннем або дзеяннем (бяздзеяннем) дзяржаўнага органа, органа мясцовага самакіравання, службовай асобы, а таксама ўдзельнічаць у судовым працэсе;

2.6. звяртацца ў Канстытуцыйны Суд з прапановай аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў; удзельнічаць у пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда пры разглядзе любых спраў і пытанняў;

2.7. у выпадку масавых або грубых парушэнняў правоў чалавека, невыканання рэкамендацый Упаўнаважанага па правах чалавека звяртацца ў Сойм з прапановай аб правядзенні парламенцкіх слуханняў або аб стварэнні часовай парламенцкай камісіі па расследаванні фактаў парушэння правоў і свабод чалавека.

3. Па выніках каляндарнага года Упаўнаважаны па правах чалавека на падставе разгледжаных матэрыялаў рыхтуе даклад аб сітуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, які заслухоўваецца на пасяджэнні Сойму. Даклады Упаўнаважанага па правах чалавека маюць публічны характар і падлягаюць апублікаванню.

4. Упаўнаважаны па правах чалавека можа мець іншыя правы і паўнамоцтвы, прадастаўленыя яму законам.

### *Артыкул 139. Забеспячэнне дзейнасці*

1. Для забеспячэння дзейнасці Упаўнаважанага па правах чалавека ствараецца офіс, які з'яўляецца дзяржаўнай установай з правам юрыдычнай асобы. Структура і парадак дзейнасці офіса рэгламентуецца палажэннем, якое зацвярджаецца Упаўнаважаным па правах чалавека. Упаўнаважаны па правах чалавека наймае супрацоўнікаў офіса і прызначае сваіх намеснікаў.

2. Офіс Упаўнаважанага па правах чалавека садзейнічае распрацоўцы інфармацыйных, адукацыйных і даследчых праграм па пытаннях правоў чалавека і прымае ўдзел у іх ажыццяўленні.

3. Упаўнаважаны па правах чалавека і яго офіс фінансуюцца са сродкаў дзяржаўнага бюджэту ў дастатковым аб'ёме, а таксама з іншых крыніц, дазволеных законам. Каштарыс расходаў распрацоўваецца і выконваецца Упаўнаважаным па правах чалавека і яго офісам самастойна.

# ГЛАВА 14. КАНТРОЛЬНАЯ ПАЛАТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## *Артыкул 140. Роля і статус*

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь - дзяржаўны орган фінансавага кантролю.

## *Артыкул 141. Прызначэнне і тэрмін паўнамоцтваў членаў Кантрольнай палаты*

1. Старшыня і члены Кантрольнай палаты прызначаюцца Соймам тэрмінам на 10 гадоў па прадстаўленні профільнай камісіі парламента з ліку асоб, якія валодаюць высокімі маральнымі якасцямі, экспертнымі ведамі і вопытам у адпаведнай сферы, і працягваюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту прызначэння свайго пераемніка.

2. Члены Кантрольнай палаты працуюць на пастаяннай аснове і па сваім службовым статусе прыраўноўваюцца да дэпутатаў Сойма.

3. Падставы для спынення паўнамоцтваў і вызвалення ад пасады членаў Кантрольнай палаты ўстанаўліваецца законам.

## *Артыкул 142. Правы і паўнамоцтвы*

1. Кантрольная палата:

1.1 ажыццяўляе аўдыт законнасці, фінансавы аўдыт і аўдыт эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання фінансамі, уласнасцю і дзяржаўнымі закупкамі;

1.2. правярае эфектыўнасць унутранай кантрольнай службы Урада і іншых органаў дзяржаўнага кіравання, Нацыянальнага банка, іншых дзяржаўных арганізацый;

1.3. праводзіць аналіз выканання дзяржаўнага бюджэту, дае заключэнне аб праекце дзяржаўнага бюджэту на наступны фінансавы год.

2. Кантрольная палата мае правы:

2.1. доступу да ўсіх дакументаў, якія адносяцца да кіравання фінансамі, запытваць вусна або пісьмова ў арганізацыі, якая правяраецца, любую інфармацыю, якую палічыць неабходнай;

2.2. пры выяўленні парушэнняў звяртацца ў кампетэнтныя органы з патрабаваннем аб прыняцці неабходных мер і прыцягненні да адказнасці вінаватых;

2.3. удзельнічаць і быць заслуханым у пасяджэннях Урада і Праўлення Нацыянальнага Банка па пытаннях, аднесеных да сферы паўнамоцтваў.

3. Іншыя правы і паўнамоцтвы, структура, парадак арганізацыі і дзейнасці Кантрольнай палаты вызначаюцца законам.

### *Артыкул 143. Падсправаздачнасць і незалежнасць*

1. У сваёй дзейнасці Кантрольная палата падсправаздачная Сойму.

2. Кантрольная палата не радзей за адзін раз у год прадстаўляе справаздачу аб выніках кантрольнай дзейнасці Сойма. Гэты даклад публікуецца.

3. Каштарыс расходаў Кантрольнай палаты распрацоўваецца і выконваецца Кантрольнай палатай самастойна і адлюстроўваецца ў дзяржаўным бюджэце асобным радком.

4. Кантрольная палата пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў незалежная ад якіх-небудзь дзяржаўных органаў і службовых асоб і кіруецца толькі законам.

5. Умяшанне ў дзейнасць Кантрольнай палаты, якое падрывае яе незалежнасць і паўнамоцтвы, цягнуць за сабой адказнасць па законе.

---

## ГЛАВА 15. КАМІТЭТ ПА НАГЛЯДЗЕ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ СЛУЖБ РАЗВЕДКІ І БЯСПЕКІ

### *Артыкул 144. Роля і статус*

Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі з'яўляецца незалежным дзяржаўным органам, які ажыццяўляе ацэнку эфектыўнасці дзейнасці, бесстароннасці і захавання закона службамі разведкі і бяспекі, якасці кантролю за імі з боку выканаўчай улады, а таксама ўнутранага кантролю.

### *Артыкул 145. Прызначэнне і тэрмін паўнамоцтваў сябраў Камітэта*

1. Старшыня і члены Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі прызначаюцца Соймам па прадстаўленні профільнай камісіі парламента з ліку асоб, якія валодаюць экспертнымі ведамі і вопытам у адпаведнай сферы тэрмінам на 10 гадоў і працягваюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту прызначэння свайго. пераемніка.

2. Падставы для спынення паўнамоцтваў і вызвалення ад пасады членаў Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі ўстанаўліваецца законам.

### *Артыкул 146. Правы і паўнамоцтвы*

1. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі:

1.1. ажыццяўляе маніторынг захавання законнасці ў рабоце службаў разведкі і бяспекі;

1.2. выконвае праверку захавання службамі разведкі і бяспекі канстытуцыйных правоў і свабод;

1.3. расследуе скаргі любых асоб па ўсіх аспектах дзейнасці службаў разведкі і бяспекі;

1.4. праводзіць аналіз і ацэнку мэтазгоднасці і эфектыўнасці дзейнасці службаў разведкі і бяспекі;

1.5. сочыць за функцыянаваннем унутраных механізмаў прадухілення, выяўленні і ліквідацыі парушэнняў.

2. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі мае права:

2.1. запытваць і атрымліваць інфармацыю, якая складае дзяржаўную таямніцу;

2.2. атрымліваць штогадовыя і любыя іншыя даклады і справаздачы, падрыхтаваныя службамі разведкі і бяспекі;

2.3. выклікаць для дачы паказанняў пад прысягай прадстаўнікоў выканаўчай улады, супрацоўнікаў службаў разведкі і бяспекі, знешніх экспертаў і іншых асоб;

2.4. праводзіць планавыя і пазапланавыя праверкі, без папярэдняга папярэджання заходзіць у службовыя памяшканні службаў разведкі і бяспекі, праводзіць апытанне супрацоўнікаў, атрымліваць доступ да баз даных і аб'ектаў;

2.5. пры выяўленні парушэнняў звярнуцца да ўнутранага органа службы разведкі або бяспекі з рэкамендацыяй аб прымяненні мер дысцыплінарнага ўздзеяння, або да Генеральнага пракурора з просьбай аб узбуджэнні крымінальнага пераследу;

2.6. звярнуцца ў профільную камісію Сойма, да члена Урада, які адказвае за дзейнасць службы разведкі або бяспекі, а таксама ў Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь з інфармацыяй аб фактах невыканання службамі разведкі або бяспекі ўстаноўленых патрабаванняў, аб выяўленых недахопах і правапарушэннях.

3. Спрэчкі ў выпадках, калі Камітэту па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі адмаўляюць у доступе да неабходнай яму інфармацыі, вырашае спецыяльны камітэт, які складаецца з члена Урада, які адказвае за дзейнасць службы разведкі або бяспекі, кіраўніка службы разведкі або бяспекі, старшыні профільнай камісіі. Сойма і Старшыні Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі.

4. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі можа мець іншыя правы і паўнамоцтвы, прадастаўленыя яму законам.

### *Артыкул 147. Падсправаздачнасць*

1. У сваёй дзейнасці Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі незалежны ад якіх-небудзь дзяржаўных органаў і службовых асоб, кіруецца толькі законам і падсправаздачны профільнай камісіі Сойма.

2. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі накіроўвае свае гадавыя справаздачы старшыні профільнай камісіі Сойма, а таксама членам Урада, якія адказваюць за дзейнасць службаў разведкі і бяспекі.

3. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі штогод публікуе прызначаныя для адкрытага доступу справаздачы аб сваёй дзейнасці і аб выніках праверак, якія не змяшчаюць сакрэтнай інфармацыі.

### *Артыкул 148. Забеспячэнне дзейнасці*

1. Камітэт па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі фінансуецца са сродкаў дзяржаўнага бюджэту. Каштарыс расходаў распрацоўваецца і выконваецца Камітэтам па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі самастойна.

2. Арганізацыя і парадак дзейнасці Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі вызначаюцца законам.

---

## ГЛАВА 16. КАМІТЭТ ПА ЭТЫЦЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ СЛУЖБЫ І СУПРАЦЬДЗЕЯННІ КАРУПЦЫІ

### *Артыкул 149. Роля і статус*

Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі з'яўляецца незалежным дзяржаўным органам па каардынацыі, маніторынгу, правядзенні следчых, прафілактычных і асветніцкіх мерапрыемстваў па барацьбе з карупцыяй.

### *Артыкул 150. Прызначэнне і тэрмін паўнамоцтваў сябраў Камітэт*

1. Старшыня і члены Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі прызначаюцца Соймам тэрмінам на шэсць гадоў па выніках адкрытага конкурсу і працягваюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту назначэння свайго пераемніка. Члены конкурснай камісіі фарміруюцца на падставе закона з ліку кандыдатаў, прапанаваных профільнай камісіяй Сойма, Прэзідэнтам і Нацыянальнай радай правасуддзя

2. Падставы для спынення паўнамоцтваў і вызвалення ад пасады членаў Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі ўстанаўліваецца законам.

### *Артыкул 151. Правы і паўнамоцтвы*

1. Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі:

1.1. каардынуе антыкарупцыйныя дзеянні паміж рознымі дзяржаўнымі і кантрольнымі органамі;

1.2. распрацоўвае і ўкараняе кодэксы этыкі на дзяржаўнай службе;

1.3. праводзіць інфармацыйныя і адукацыйныя праграмы па фарміраванні нецярпімага стаўлення да карупцыі;

1.4. ажыццяўляе нагляд за недапушчэннем канфлікту інтарэсаў, за дэклараваннем маёмасці дэпутатамі, дзяржаўнымі служачымі, выбарнымі службовымі асобамі, пракурорамі і суддзямі;

1.5. выяўляе і арганізуе расследаванне злачынстваў, звязаных з хабарніцтвам і карупцыяй, гандлем уплывам, злоўжываннем становішчам з боку вышэйшых службовых асоб;

1.6. ажыццяўляе экспертызу і прадстаўляе рэкамендацыі па ўкараненні этычных стандартаў, барацьбе з карупцыяй і ўдасканаленні заканадаўства ў гэтай сферы;

1.7. ажыццяўляе маніторынг і ацэнку эфектыўнасці антыкарупцыйных мер.

2. Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі мае права:

2.1. праводзіць аператыўна-вышуковыя і арганізоўваць следчыя мерапрыемствы;

2.2. пры выяўленні парушэнняў звярнуцца да дзяржаўнага органа з рэкамендацыяй аб прымяненні мер дысцыплінарнага ўздзеяння, або да Генеральнага пракурора з просьбай аб узбуджэнні крымінальнага пераследу.

3. Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі можа мець іншыя правы і паўнамоцтвы, прадстаўленыя яму законам.

## *Артыкул 152. Падсправаздачнасць*

1. У сваёй дзейнасці Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі падсправаздачны Сойму

2. Грамадскі нагляд за дзейнасцю Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі ажыццяўляе Назіральная рада, якая фармуецца ў адпаведнасці з законам з ліку прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый

3. Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі кожныя шэсць месяцаў накіроўвае фінансавую справаздачу і справаздачу аб праведзенай рабоце ў Сойм, Прэзідэнту і Прэм'ер-міністру, а таксама размяшчае іх у адкрытым доступе.

## *Артыкул 153. Забеспячэнне дзейнасці*

1. Камітэт па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі фінансуецца са сродкаў дзяржаўнага бюджэту. Каштарыс расходаў распрацоўваецца і выконваецца Камітэтам па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянню карупцыі самастойна

2. Арганізацыя і парадак дзейнасці Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі вызначаюцца законам.

# ГЛАВА 17. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ФІНАНСЫ

## *Артыкул 154. Бюджэтная сістэм*

1. Бюджэтная сістэма Рэспублікі Беларусь уключае самастойны дзяржаўны бюджэт, самастойныя мясцовыя бюджэты і дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды.

2. Фінансавы год для ўсіх бюджэтаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца з 1 студзеня па 31 снежня.

3. Даходы бюджэтаў фарміруюцца за кошт падаткаў, іншых абавязковых плацяжоў, якія вызначаюцца законам, а таксама іншых паступленняў.

4. Нарматывы адлічэнняў ад дзяржаўных падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў, якія ў адпаведнасці з законам поўнасцю або часткова накіроўваюцца ў мясцовыя бюджэты, устанаўліваюцца з улікам аб'ёму паўнамоцтваў органаў мясцовага самакіравання.

5. Міжбюджэтныя адносіны органаў дзяржаўнай улады і органаў мясцовага самакіравання рэгулююцца законам.

6. У адпаведнасці з законам у Рэспубліцы Беларусь могуць стварацца дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды. Зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, справаздач аб іх выкананні і кантроль за выкарыстаннем праводзяцца ў парадку, прадугледжаным для дзяржаўнага бюджэту.

## *Артыкул 155. Падатковая сістэма*

1. Сістэма падаткаў і збораў, якія спаганяюцца ў дзяржаўны і мясцовыя бюджэты, адлічэнні ў дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, а таксама сістэма прававой абароны падаткаплацельшчыка ўстанаўліваюцца законам

2. Увядзенне, змяненне або адмена падаткаў, прадастаўленне падатковых ільгот не можа быць дэлегавана органам выканаўчай улады

3. Узровень падатковай нагрузкі з улікам адлічэнняў у дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды не павінен перавышаць дзве пятыя валавога ўнутранага прадукту. Адступленні дапускаюцца ў выключных выпадках рашэннем Сойма, прынятага большасцю не менш як за тры пятыя галасы ад канстытуцыйнага складу.

## *Артыкул 156. Дзяржаўны бюджэт*

1. Праект дзяржаўнага бюджэту складаецца Урадам і ўносіцца на разгляд у Сойм не пазней як за 90 дзён да завяршэння фінансавага года.

2. Пры разглядзе праекта дзяржаўнага бюджэту Сойм можа павялічваць расходы толькі пры ўказанні крыніц фінансавання гэтых расходаў. Нельга памяншаць прадугледжаныя законамі выдаткі да ўнясення змен у гэтыя законы.

3. Праект дзяржаўнага бюджэту зацвярджаецца законам да пачатку новага фінансавага года.

4. Калі дзяржаўны бюджэт своечасова не зацвярджаецца, яго расходы ў пачатку фінансавага года на кожны месяц не могуць перавышаць за адну дванаццатую памеру расходаў дзяржаўнага бюджэту за папярэдні год.

5. На працягу фінансавага года Сойм можа ўносіць змены ў бюджэт. Змяненні ў бюджэт уносяцца ў тым жа парадку, у якім ён складаецца і зацвярджаецца.

6. Справаздача аб выкананні дзяржаўнага бюджэту прадстаўляецца Урадам на разгляд Сойму не пазней за пяць месяцаў з дня заканчэння справаздачнага фінансавага года разам з інфармацыяй аб стане дзяржаўнага доўгу і на працягу 90 дзён з дня прадстаўлення справаздачы па ім прымаецца адпаведнае рашэнне. Справаздача аб выкананні дзяржаўнага бюджэту публікуецца разам з нарматыўнымі прававымі актамі, прынятымі па выніках разгляду справаздачы.

7. Парадак складання, зацвярджэння і выканання дзяржаўнага бюджэту і дзяржаўных пазабюджэтных фондаў вызначаецца законам.

## *Артыкул 157. Доўг*

1. Атрыманне дзяржавай і адзінкамі мясцовага самакіравання пазык і крэдытаў, а таксама прадастаўленне імі фінансавых гарантый і паручальніцтваў робяцца ў адпаведнасці з законам.

2. Забараняецца браць пазыкі, крэдыты або прадастаўляць фінансавыя гарантыі і паручальніцтвы, з прычыны якіх дзяржаўны доўг перавысіць дзве пятыя валавога ўнутранага прадукта. Адступленні дапускаюцца ў выключных выпадках рашэннем Сойма, прынятага большасцю не менш як за тры пятыя галасы ад канстытуцыйнага складу. Спосаб падліку валавога ўнутранага прадукта, а таксама дзяржаўнага доўгу вызначаецца законам.

## *Артыкул 158. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь*

1. Нацыянальны банк з'яўляецца цэнтральным банкам і дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь, які адказвае за забеспячэнне цэнавай стабільнасці, абарону кошту нацыянальнай грашовай адзінкі і ўстойлівасць фінансавай сістэмы.

2. Нацыянальны банк рэгулюе крэдытныя адносіны, грашовае абарачэнне, вызначае парадак разлікаў, ажыццяўляе банкаўскі нагляд і валодае выключным правам эмісіі грошай.

3. Нацыянальны банк незалежны ў сваёй дзейнасці і самастойна вызначае параметры грашова-крэдытнай палітыкі.

4. Кіраўніцтва Нацыянальным банкам ажыццяўляецца Праўленнем банка ў складзе яго Старшыні, намеснікаў Старшыні і членаў. Старшыня, яго намеснікі і члены Праўлення Нацыянальнага банка назначаюцца Соймам тэрмінам на сем гадоў і прадаўжаюць займаць пасаду пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў да моманту назначэння свайго пераемніка.

5. Сойм штогод заслухоўвае даклад Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка аб стане грашова-крэдытнай палітыкі ў краіне.

6. Парадак арганізацыі і дзейнасці Нацыянальнага банка, яго паўнамоцтвы, а таксама прававы статус Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка і падставы для яго вызвалення ад пасады ўстанаўліваюцца арганічным законам.

---

# ГЛАВА 18. ЗМЯНЕННЕ КАНСТЫТУЦЫІ

## *Артыкул 159. Права на ініцыятыву*

Пытанне аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі разглядаецца Соймам па ініцыятыве не менш як за 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія маюць права выбіраць, або не менш як за адну чацвёртую ад канстытуцыйнага складу дэпутатаў Сойма.

## *Артыкул 160. Парадак разгляду і галасавання*

1. Праект канстытуцыйнага закона аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі прадстаўляецца ў Сойм, які публікуе яго для ўсенароднага абмеркавання. Калі ўнесены адзін праект канстытуцыйнага закона, якія-небудзь іншыя праекты павінны быць унесены на працягу трыццаці дзён.

2. Праект канстытуцыйнага закона разглядаецца Соймам пры наяўнасці заключэння Канстытуцыйнага Суда аб адпаведнасці праекта патрабаванням артыкула 162 Канстытуцыі.

3. Першае чытанне праекта канстытуцыйнага закона ў Сойме пачынаецца не раней за трыццаць дзён пасля яго апублікавання. Праект канстытуцыйнага закона ў першым і другім чытанні прымаецца большасцю не менш як за тры пятыя галасы дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма.

4. Праект канстытуцыйнага закона ў трэцім чытанні прымаецца большасцю не менш як за тры пятыя галасы дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма не раней за шэсць месяцаў пасля прадстаўлення праекта канстытуцыйнага закона ў Сойм з адкладам яго для далейшага прыняцця па адной з наступных працэдур:

4.1. у выпадку змяненняў у главе 1 "Асновы канстытуцыйнага ладу" і главе 18 "Змяненне Канстытуцыі" канстытуцыйны закон прымаецца нацыянальным рэферэндумам. Рэферэндум не можа быць праведзены раней за тры месяцы пасля прыняцця Соймам праекта канстытуцыйнага закона ў трэцім чытанні. Закон аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі лічыцца прынятым, калі за яго

прагаласавала большасць ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, унесеных у спісы для галасавання;

4.2. у астатніх выпадках канстытуцыйны закон прымаецца наступным складам Сойма. Закон аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі лічыцца прынятым, калі наступны склад Сойма ў першым і адзіным чытанні большасцю не менш як за тры пятыя дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма прагаласуе за яго прыняцце без змяненняў.

### Артыкул 161. Падпісанне і апублікаванне

1. Прыняты канстытуцыйны закон падпісваецца Прэзідэнтам і не пазней за пяць дзён афіцыйна публікуецца. Прэзідэнт не можа вярнуць закон аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі не падпісаным у Сойм у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 86 Канстытуцыі.

2. Калі ў названы тэрмін такі закон Прэзідэнтам не падпісваецца, гэты канстытуцыйны закон уступае ў сілу пасля яго падпісання Старшынёй Сойма і афіцыйнага апублікавання.

3. Закон аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі ўступае ў сілу не раней як праз месяц пасля яго прыняцця.

4. Новы тэкст Канстытуцыі публікуецца разам з канстытуцыйным законам аб яе змене.

### Артыкул 162. Межы зменаў

1. Пункт 1 артыкула 1 Канстытуцыі змене не падлягае. Ні адна змена Канстытуцыі не павінна супярэчыць пункту 1 артыкула 1 Канстытуцыі.

2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не можа быць зменена, калі змены прадугледжваюць парушэнне абавязацельстваў палажэнняў міжнароднага права.

3. Змяненні ў тэрмінах паўнамоцтваў і кампетэнцый для любой службовай асобы або выбарчага органа, выбранне або назначэнне якіх прадугледжана дадзенай Канстытуцыяй, не распаўсюджваюцца на дзеючую службовую асобу або выбарчы орган, і могуць уступіць у сілу толькі пасля наступных назначэнняў або выбараў.

4. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не можа быць зменена ва ўмовах ваеннага або надзвычайнага становішча.

5. Праект канстытуцыйнага закона, які быў разгледжаны Соймам і не быў прыняты, можа быць паўторна прадстаўлены ў Сойм не раней як праз год з дня прыняцця рашэння па гэтаму законапраекту.

# ГЛАВА 19. ПЕРАХОДНЫЯ І ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## *Артыкул 163. Уступленне ў сілу Канстытуцыі*

Сапраўдная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання або пасля заканчэння чатырнаццаці дзён з даты афіцыйнага абнародавання вынікаў рэферэндуму па прыняцці дадзенай Канстытуцыі, у залежнасці ад таго, якая падзея наступіць раней.

## *Артыкул 164. Папярэдняе заканадаўства*

1. Законы, іншыя нарматыўныя прававыя акты або іх часткі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь да прыняцця дадзенай Канстытуцыі, сапраўдныя ў той меры, наколькі яны не супярэчаць Канстытуцыі, і захоўваюць сваю сілу да прызнання іх страціўшымі сілу або да іх прывядзення ў адпаведнасць з палажэннямі Канстытуцыі.

2. Пастаянныя камісіі Сойма і Урад на працягу аднаго года з дня ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі павінны прадставіць Сойму пералік міжнародных дагавораў, якія ўключаюць палажэнні, якія не адпавядаюць дадзенай Канстытуцыі.

3. Сойм павінен прыняць законы, якія падлягаюць прыняццю ў сувязі з уступленнем у сілу гэтай Канстытуцыі, у наступныя тэрміны пачынаючы з даты ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі:

3.0. аб Канстытуцыйным судзе - на працягу трох месяцаў;

3.1. арганізацыя і правядзенне выбараў і рэферэндумаў - 1 год;

3.2. арганізацыя і дзейнасць Сойма - 1 год;

3.3. парадак ажыццяўлення паўнамоцтваў Прэзідэнта - 1 год;

3.4. арганізацыя і дзейнасць Урада - 1 год;

3.5. аб Упаўнаважаным па правах чалавека - 1 год;

3.6. арганізацыя і дзейнасць Кантрольнай палаты - 1 год;

3.7. арганізацыя і дзейнасць Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі - 1 год;

3.8. арганізацыя і дзейнасць Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі - 1 год;

3.9. судаўладкаванне і статус суддзяў, судаводства, арганізацыя і дзейнасць пракуратуры, арганізацыя і дзейнасць адвакатуры - 2 гады;

3.10. арганізацыя і дзейнасць Нацыянальнай рады правасуддзя - 2 гады;

3.11. асновы мясцовага самакіравання - 2 гады;

3.12. арганізацыя і дзейнасць палітычных партый, грамадскіх і рэлігійных арганізацый, прафесійных саюзаў; аб сродках масавай інфармацыі і камунікацыі - 3 гады;

3.13. любыя іншыя законы, прадугледжаныя сапраўднай Канстытуцыяй - 5 гадоў.

4. Сойм большасцю не менш як за тры пятыя галасоў ад канстытуцыйнага складу можа прадоўжыць на адзін год тэрмін, устаноўлены ў дачыненні да любога канкрэтнага падпункта згодна з пунктам 3 гэтага артыкула, і зрабіць гэта толькі адзін раз у дачыненні да любога канкрэтнага падпункта.

5. Калі Сойм не прымае якія-небудзь канкрэтныя законы ў вызначаны час, любая асоба можа падаць скаргу ў Канстытуцыйны Суд па гэтым пытанні.

6. Канстытуцыйны Суд пры разглядзе скаргі згодна з пунктам 5 гэтага артыкула можа:

6.1. прыняць рашэнне, якое прадпісвае Сойму прыняць меры для забеспячэння прыняцця неабходнага закона на працягу перыяду, указанага ў рашэнні, і паведаміць аб ходзе работы Канстытуцыйнаму Суду;

6.2. прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах Сойма.

## *Артыкул 165. Прызначэнне членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі*

1. Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў рэарганізуецца ў Цэнтральную выбарчую камісію Рэспублікі Беларусь.

2. Пры назначэнні членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі ўпершыню пасля ўваходжання ў сілу гэтай Канстытуцыі партыі, зарэгістраваныя ў Рэспубліцы Беларусь ва ўстаноўленым парадку, назначаюць па аднаму члену ў склад Цэнтральнай выбарчай камісіі не пазней за 30 дзён пасля ўступлення ў сілу сапраўднай Канстытуцыі. На колькасць сябраў першага складу Цэнтральнай выбарчай камісіі не распаўсюджваецца дзеянне пункта 2 артыкула 63 Канстытуцыі.

3. Цэнтральная выбарчая камісія не пазней за 60 дзён пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі прымае часовае палажэнне аб працэдуры рэалізацыі выбарчай сістэмы ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 70 Канстытуцыі і прызначае дату датэрміновых выбараў Сойма.

4. Тэрмін паўнамоцтваў членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, назначаных упершыню пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі, заканчваюцца пасля правядзення датэрміновых выбараў Сойма ў адпаведнасці з артыкулам 166 гэтай Канстытуцыі і фарміравання Цэнтральнай выбарчай камісіі ў адпаведнасці з артыкулам 63 гэтай Канстытуцыі.

## Артыкул 166. Датэрміновыя выбары Сойма

1. Датэрміновыя выбары Сойма павінны быць праведзены не пазней за пяць месяцаў пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.

2. Тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і яго дэпутатаў заканчваецца, калі абраны Сойм збіраецца на першае пасяджэнне.

## Артыкул 167. Выбары Прэзідэнта ўпершыню і абмежаванне тэрмінаў паўнамоцтваў Прэзідэнта

1. Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта ўпершыню пасля ўваходжання ў сілу гэтай Канстытуцыі кандыдаты на пасаду Прэзідэнта вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў у парадку, устаноўленым законам. Дзеянне пункта 3 артыкула 90 Канстытуцыі ў частцы таго, што кандыдаты на пасаду Прэзідэнта вылучаюцца таксама палітычнымі партыямі, якія маюць фракцыю ў Сойме, уступае ў сілу з моманту правядзення другіх выбараў Прэзідэнта пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.

2. Дзеянне пункта 2 артыкула 90 Канстытуцыі ў частцы таго, што адна і тая ж асоба не можа быць Прэзідэнтам больш за два тэрміны на працягу свайго жыцця таксама прымяняецца да тэрмінаў паўнамоцтваў асоб, якія выконвалі абавязкі Прэзідэнта да ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.

## Артыкул 168. Прызначэнне суддзяў Канстытуцыйнага Суда

1. Паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь спыняюцца адразу пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.

2. Суддзі Канстытуцыйнага Суда павінны быць прызначаны на працягу трох месяцаў пасля пачатку паўнамоцтваў Сойма.

3. Пры назначэнні суддзяў Канстытуцыйнага Суда ўпершыню пасля ўступлення ў сілу дадзенай Канстытуцыі прадстаўляюцца Старшынёй Вярхоўнага Суда двое суддзяў назначаюцца тэрмінам на тры гады, двое - на шэсць гадоў і адзін - на дзевяць гадоў; двое суддзяў, што прадстаўляюцца Прэзідэнтам, назначаюцца тэрмінам на тры гады, адзін - на шэсць гадоў і двое - на дзевяць гадоў; якія прадстаўляюцца Старшынёй Сойму адзін суддзя прызначаецца тэрмінам на тры гады, двое - на шэсць гадоў і двое - на дзевяць гадоў.

4. Суддзі Канстытуцыйнага Суда, якія будуць прызначацца тэрмінам на тры гады і шэсць гадоў, пасля не менш як трохгадовага перапынку могуць заняць гэтыя пасады яшчэ на адзін тэрмін паўнамоцтваў.

## Артыкул 169. Фарміраванне Нацыянальнай рады правасуддзя ўпершын

1. Пры фарміраванні Нацыянальнага савета правасуддзя ўпершыню пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі адна трэць членаў Нацыянальнага савета правасуддзя выбіраецца з'ездам суддзяў Рэспублікі Беларусь, як дзейных, так і

тых, хто знаходзіцца ў адстаўцы. Адна трэць членаў Нацыянальнай рады правасуддзя абіраецца з'ездам прадстаўнікоў юрыдычных вышэйшых навучальных устаноў, навуковых устаноў, аб'яднанняў адвакатаў, грамадскіх арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у галіне права. Адна трэць членаў Нацыянальнага савета правасуддзя выбіраецца Соймам з ліку міжнародных экспертаў па прадстаўленні Прэзідэнта.

2. Нацыянальны савет правасуддзя на працягу першага тэрміну сваіх паўнамоцтваў павінен ажыццявіць працэдуру пацвярджэння адпаведнасці суддзяў займаемай пасады па крытэрыях кампетэнтнасці, прафесійнай этыкі і добрапрыстойнасці. Працэдура пацвярджэння адпаведнасці суддзяў займаемай пасады прыраўноўваецца да дзеяння артыкула 121 Канстытуцыі аб назначэнні суддзі на пасаду і на яе не распаўсюджваецца дзеянне пункта 4 артыкула 122 Канстытуцыі.

## *Артыкул 170. Фарміраванне Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь*

1. Камітэт дзяржаўнага кантролю рэарганізуецца ў Кантрольную палату Рэспублікі Беларусь.

2. Старшыня і члены Кантрольнай палаты павінны быць назначаны не пазней за 90 дзён пасля пачатку паўнамоцтваў Сойма.

## *Артыкул 171. Абранне Упаўнаважанага па правах чалавека ўпершыню*

Упаўнаважаны па правах чалавека павінен быць прызначаны не пазней за шэсць месяцаў пасля пачатку паўнамоцтваў Сойма. Калі да гэтага часу закон аб Упаўнаважаным па правах чалавека не будзе прыняты, назначэнне праводзіцца на аснове палажэння аб конкурсе, зацверджанага пастановай Сойма.

## *Артыкул 172. Фарміраванне Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі ўпершыню*

Старшыня і члены Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі павінны быць назначаны Соймам не пазней за 90 дзён пасля прыняцця закона аб арганізацыі і парадку дзейнасці Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі, але не пазней за два гады пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.

## *Артыкул 173. Фарміраванне Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і процідзеянні карупцыі ўпершыню*

Старшыня і члены Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і процідзеянні карупцыі павінны быць назначаны Соймам не пазней як за 90 дзён пасля прыняцця закона аб арганізацыі і парадку дзейнасці Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і процідзеяння карупцыі, але не пазней як праз два гады пасля ўступлення ў сілу гэтай Канстытуцыі.